«ГАЗЕТНАЯ» МОЛАДЗЬ 100 ГАДОЎ ТАМУ 8

ВЫЦІНАНКА — АЎТАТРЭНІНГ ДЛЯ НЕРВАЎ 10

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

20 КРАСАВІКА 2021 г. АЎТОРАК № 73 (29442)

ЗВЯЗДА

Каб вакол стала чысцей

Прэзідэнт паўдзельнічаў у рэспубліканскім суботніку, а пасля ў размове з журналістамі зрабіў шэраг сенсацыйных заяў

Фота БелТА.

Месца сілы

Александрыя — аграгарадок, які выдзяляецца з шэрагу іншых. Не толькі таму, што тут правёў дзіцячыя гады першы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і штогод праходзіць папулярны міжнародны фестываль «Александрыя збірае сяброў». Аграгарадок месціцца на беразе Дняпра, які заўсёды быў сімвалам адзінства трох славянскіх народаў. Рака — частка легендарнага гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі», таму тут спрадвеку праходзілі кірмашы і народныя гуляні, фарміраваліся традыцыі добрасуседства. Сёння праз Дняпро пралягае мост, які звязвае не толькі два пасёлкі Копысь і Александрыю, бы Магілёўскую вобласць з Віцебскай, але яшчэ і месца, дзе нарадзіўся Аляксандр Лукашэнка, і вёску, якую ён лічыць сваёй малой радзімай.

Працаваць у гэтым годзе на александрыйскі бераг ракі прыехала ладная брыгада, якую сабраў Прэзідэнт: яго сыны, сябры і вядомы з мінулага суботніка любімец сям'і Лукашэнкі шпіц Умка. На сваёй малой радзіме Аляксандр Лукашэнка з камандай добраўпарадкавалі і азелянілі тэрыторыю вакол фестывальнай пляцоўкі «Александрыя збірае сяброў».

Пасля прыбыцця да месца правядзення суботніка Аляксандр Лукашэнка прайшоў інструктаж па тэхніцы бяспекі і распісаўся ў адпаведным журнале. Ён успомніў, як у гэтым месцы, дзе цяпер стаіць сучасны мост, у гады яго дзяцінства была пераправа праз Дняпро. На супрацьлеглым баку ракі — пасёлак гарадскога тыпу Копысь. Менавіта на яго прыкладзе ў свой час пачалася мадэрнізацыя падобных населеных пунктаў па ўсёй краіне. «Менавіта выходзячы з тых грошай, якія сёння ёсць. Адсюль пачыналася мадэрнізацыя сельскай гаспадаркі і гарадскіх пасёлкаў», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што стаіць задача ў падобных населеных пунктах за мінімальны кошт выдзяляць участкі для ахвотных пабудаваць сабе дом. «Так павінна быць усюды. Але паглядзім, ці так гэта», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

* * *

Пасля высаджвання дрэў Прэзідэнт паразмаўляў з журналістамі і адказаў на іх пытанні. Першае: чаму сёлета ў Год роднага адзінства на суботнік ён прыехаў у Александрыю?

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, у сярэдзіне няпростых 90-х народнае адзінства пачыналася з гэтага месца на Шклоўшчыне, і тады краіне ўдалося аб'яднацца вакол чалавека, які нарадзіўся на гэтай зямлі.

«А потым думаю: калі прыедзеш яшчэ на родную зямлю, дамоў? Часу заўсёды не хапае. А тут нагода ёсць і папрацаваць. А яшчэ маё дзецішча — «Александрыя збірае сяброў». Неабходна ўпрыгожваць гэтую тэрыторыю. Добра будзе калі-небудзь у старасці прайсці гэтым шляхам і паглядзець, як выратуюць тут дрэвы», — сказаў Прэзідэнт.

На алеі вакол амфітэатра, які будуюць да фестывалю, кіраўнік краіны і яго памочнікі высадзілі рабіны, ліпы, дубы, паклалі дзёран.

Як дадаў Прэзідэнт, яшчэ адзін суботнік ён правядзе вакол свайго дома на Міншчыне — высадзіць там саджанцы сасны і дуба.

«Гэта мой любімы занятак — упрыгожваць зямлю і тэрыторыю», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Не «хваля»вацца

Яшчэ адно пытанне ад журналістаў — наконт чарговай хвалі каранавіруса. Адказ Прэзідэнт пачынае з паведамлення: пад'ём чакалі, нават у паўтара раза вышэйшы, чым на самай справе: «Зараз у нас 38—39 працэнтаў ад асення-зімовага піку».

«Я асабліва не перажываю. Мы стваралі дастаткова вакцын для таго, каб хоць бы на час засцерагчы ад небяспекі людзей. Мы не ведаем, які час вакцына будзе дзейнічаць. Але тое, што яна ахоўвае людзей на шэсць-восем месяцаў, — гэта дакладна. А далей ніхто не ведае, нават вучоныя», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён сцвярджае, што смяротнасць у нас не падрасла нават ад коўіду.

«Яшчэ раз паўтараю: людзі памыляюць не ад самога віруса. Вірус актывізуе тыя хранічныя хваробы, якія ёсць у чалавека. Нават тыя хваробы, якія мы часам не бачым», — нагадаў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што свет застанецца жыць з такімі вірусамі, таму неабходна весці здаровы лад жыцця.

«Нам неабходна ўзяцца за сябе і сваё жыццё — больш працаваць, нармальна харчавацца. Колькі раз казаў: неабходна есці сваё, з нашай зямлі», — мякую Аляксандр Лукашэнка і просіць не перажываць з-за пандэміі: медыкі вылечаць усіх.

«Паўзучы пераварот», які не ўдаўся

Адказваючы на пытанні, Аляксандр Лукашэнка расказаў пра свае ўражанні ад фільма «Манкурты», які выйшаў на АНТ.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што не глядзеў фільм непасрэдна ў момант выхаду, бо ведаў выкладзеныя ў ім факты раней. «Пакуль мы не змаглі паказаць усё, ідзе расследаванне. Многія людзі, шчыра кажучы, знаходзяцца пад кантролем. Мы іх бачым. Пакуль яшчэ рана раскрываць усё», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама Аляксандр Лукашэнка ў размове расказаў тое, што стала галоўнай навіной выхадных, і не толькі ў нашай краіне, — пра замах, які рыхтаваўся на яго і яго сыноў, дзе замяшаны замежныя спецслужбы. Гэтую заяву ён зрабіў у кантэксце адказу на пытанне пра падрабязнасці затрымання ў Маскве шэрагу асоб.

СТАР. 2

Прыёмная кампанія — 2021

«ВЕРАГОДНАСЦЬ УГАДВАННЯ НА ЦТ ЗНІЖАЕЦЦА»

15 новых спецыяльнасцяў, у тым ліку чатыры абсалютна новыя, па якіх падрыхтоўка раней нідзе не вялася, адкрыюцца сёлета ў беларускіх ВНУ. Пра гэта паведаміў падчас брыфінгу ў БелТА начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ.

МЕДЫКІ — У ДЭФІЦЫЦЕ

Так, у БНТУ распачнуць падрыхтоўку спецыялістаў па прамысловым дызайне транспартных сродкаў і вытворчага абсталявання. У БДУ ўводзяцца спецыяльнасці «Рэгіёназнаўства» і «Эканамічная бяспека». А ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі — спецыяльнасць «Лётная эксплуатацыя паветраных суднаў грамадзянскай авіяцыі» з кваліфікацыяй «Спецыяліст па лётнай эксплуатацыі грамадзянскіх судоў. Інжынер-пілот».

Сяргей Каспяровіч запэўніў, што падчас уступнай кампаніі 2021 года захаваюцца ўсе традыцыйныя падыходы ў правілах прыёму на ўсіх узроўнях атрымання адукацыі.

У ВНУ плануецца прыняць каля 54,9 тысячы чалавек: за кошт сродкаў бюджэту — каля 27,8 тысячы, што больш чым на 1 працэнт перавышае план прыёму 2020 года, на платную форму — 27,1 тысячы, што крыху ніжэй за леташні план.

На ўзроўні вышэйшай адукацыі сёлета запланавана павялічыць набор за кошт сродкаў бюджэту на медыцынскіх спецыяльнасцях (прыкладна на 160 месцаў), а таксама па некаторых педагагічных спецыяльнасцях і на «архітэктуру і будаўніцтва». Крыху скарэкціраваны аб'ёмы набору ў бок змяншэння па шэрагу ІТ-спецыяльнасцяў і тэхнічных спецыяльнасцяў на платнай аснове.

Усяго прыём на ўзроўні вышэйшай адукацыі будзе весціся больш чым на 320 спецыяльнасцях.

— Кантрольныя лічбы ўзгоднены, зацверджаны і даведзены да зацікаўленых да 1 красавіка на сайтах устаноў адукацыі і па іншых каналах інфармавання. Яны фарміраваліся з улікам патрэбаў рынку працы, — адзначыў Сяргей Каспяровіч. — Лічбы прыёму на мэтавую падрыхтоўку стануць вядомыя 1 мая, істотных змен у параўнанні з планам прыёму 2020 года тут не чакаецца. Гэту інфармацыю можна будзе знайсці на сайтах дзяржорганаў кіравання, мясцовых органаў улады і ўстаноў адукацыі.

Мэтавая падрыхтоўка на сёння вядзецца для сферы аховы здароўя (штогод на ўзроўні вышэйшай адукацыі набор плануецца больш за 800 чалавек), сельскай гаспадаркі (600 і больш чалавек у год), адукацыі (больш за 600 у год). У іншых сферах мэтавая падрыхтоўка асобных спецыялістаў носіць больш кропкавы характар.

Падыходы ў мэтавай падрыхтоўцы захаваныя. Заказчыкам можа быць толькі арганізацыя, размешчаная ў сельскай мясцовасці, невялікіх гарадах з колькасцю насельніцтва да 20 тысяч, а таксама на тэрыторыях, што пацярпелі ад забруджвання ў выніку аварыі на ЧАЭС. Але гэта датычыцца толькі ўзроўняў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Што датычыцца прафтэхадукацыі, тут заказчыкамі мэтавай падрыхтоўкі могуць быць любыя арганізацыі: і сталічныя, і рэгіянальныя. Гэты падыход захоўваецца ў гэтым годзе. А ў праекце новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі прадугледжана зняцце абмежаванняў па месцы знаходжання заказчыка.

Сяргей Каспяровіч дадаў, што актыўны дзесяцікласнік цалкам можа заявіць пра сябе будучаму работадаўцу і хадайнічаць аб тым, каб праз год наймальнік, калі ён палічыць неабходным, заявіў на ўстаноўленым парадку мэтавае месца. «Але на мэтавае месца можа скласціся конкурс. Нават падпісаўшы дамову з заказчыкам, абітурыент можа апынуцца ў сітуацыі канкурсацыі. Але мэтавае месца метадам такіх дзеянняў можна ініцыяваць. У любым выпадку вырашае тут наймальнік, заказчык кадраў», — падкрэсліў Сяргей Каспяровіч.

СТАР. 3

Вясна ідзе! Вясне — дарогу!

Фота Анатоля КЛЕШКІНА.

Мінск, Лошыцкі парк. Нядзеля.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У выніку крушэння цягніка ў Егіпце загінулі 11 чалавек

Пасажырскі цягнік сышоў з рэек на поўнач ад Каіра. Падчас катастрофы загінулі па меншай меры 11 чалавек, паведаміла Associated Press. Цягнік накіроўваўся з егіпецкай сталіцы ў горад Мансура, што ў дэльце Ніла, растлумачылі ў чыгуначным упраўленні. Міністэрства аховы здароўя заявіла, што акрамя загінулых каля 100 чалавек атрымалі раненні, прычым большасць з іх пацярпелі ад пераломаў, парэзаў і ўдараў. Дзяржаўная газета «Ахрам Дэйлі» паведаміла пра затрыманне ўладамі па меншай меры 10 чыгуначных чыноўнікаў, уключаючы машыніста цягніка і яго памочніка, у чаканні расследавання авіякатастрофы. Чыгуначная аварыя адбылася праз тры тыдні пасля сутыкнення двух пасажырскіх цягнікоў у правінцыі Сохаг, у выніку чаго загінулі 18 чалавек і яшчэ 200 пасажыраў, у тым ліку дзеці, атрымалі раненні.

Галоўную аўтастраду Італіі перакрылі рэстаратары

Уладальнікі рэстаранаў, якія патрабуюць ад улад Італіі як мага хутчэй адмяніць каранцінныя меры, уведзеныя ў сувязі з пандэміяй COVID-19, заблакіравалі рух па аўтастрадзе A1 Мілан — Неапаль у раёне горада Інчыза пад Фларэнцыяй. Аб гэтым паведаміла РІА «Навіны» Такая акцыя пратэсту была арганізавана па ініцыятыве асацыяцыі рэстатараў «Абарона нацыянальных прадпрыемстваў» (TNI), якая вяла прамую трансляцыю з месца маніфестацыі ў Facebook. Маніфестанты перакрылі рух па аўтастрадзе A1 у абодвух напрамках. Яны накрылі сталікі проста на дарозе, імітуючы абед на адкрытым паветры. У выніку на аўтастрадзе ўтварыліся шматкіламетровыя пробкі. На працягу двух апошніх тыдняў у многіх гарадах Італіі, у тым ліку ў Рыме і Мілане, практычна штодня праходзяць розныя маніфестацыі супраць уведзеных уладамі абмежаванняў на дзейнасць прадстаўнікоў малога бізнесу ва ўмовах пандэміі каранавіруса. Некаторыя з гэтых акцый забяспечылі сутыкненні паміж пратэстоўцамі і прадстаўнікамі праваахоўных органаў. Раней прэм'ер-міністр Італіі Марыё Драгі абвясціў, што каранцінныя меры будуць адчувальна паслаблены з 26 красавіка. Пры гэтым у краіне па-ранейшаму з 22.00 будзе дзейнічаць камендацкая гадзіна.

Верталёт NASA паспяхова здзейсніў першы палёт на Марсе

Верталёт-робат Ingenuity, які прыбыў на Марс разам з марсаходам Perseverance, здзейсніў першы выпрабавальны палёт на Чырвонай планеце, паведаміла Амерыканскае касмічнае агенцтва. Вышыня першага палёту, які доўжыўся каля 20 секунд, склала каля трох метраў. Падчас гэтага «рэйсу» марсаход Perseverance рэтранслёраваў на Зямлю здымкі і данныя, атрыманыя верталётам. Падчас наступных палётаў верталёт плануюць падняць да пяці метраў. Работа Ingenuity разлічана на 31 дзень. Падчас палётаў на Марсе ён будзе праводзіць аэрафотаздымку мясцовасці. Ingenuity 1,2 метра ў дыяметры і вагой 1,8 кілаграма. Абсталяваны ён дзвюма камерамі. Апарат здольны завісаць у паветры на 20—30 секунд для фатаграфавання мясцовасці.

КОРАТКА

- **БЧ прызначыла больш чым 70 дадатковых цягнікоў на святы.**
- Ядзернае паліва для другога энергаблока даставілі на БелАЭС.
- **Больш чым 2,3 тысячы фур сабралася ў чарзе на выезд з Беларусі ў краіны ЕС.**
- Больш за 500 працоўных месцаў прапануюць наймальнікі Мінска на кірмашы вакансій 22 красавіка.
- **Беларусь і Кітай маюць намер развівць супрацоўніцтва ў ваеннай адукацыі.**

- Прымаюцца конкурсныя работы на міжнародны фестываль «ФотаКрок» у Віцебску.

Кузня чэмпіёнаў

БАСКЕТБОЛ ШУКАЕ ТАЛЕНТЫ

Стагадовы спорт робіць крок у будучыню

Першы крок у вялікі спорт робіцца ў звычайных спартыўных залах, дзе вопытныя трэнеры перадаюць свае веды маленькім спартсменам і маладым калегам. Менавіта такі пасыл мае праект «Крок у будучыню», які рэалізоўвае Беларуская федэрацыя баскетбола разам з ФІБА Еўропа з 2018 года. «Крок у будучыню» — сапраўдная кузня баскетбольных талентаў — уключае шэраг семінараў у рэгіёнах, адбор найлепшых гульцоў і грандыёзны фінал у Мінску.

Фота Беларускай федэрацыі баскетбола.

СТАР. 12

ISSN 1990 - 763X

Каб вакол стала чысцей

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Я чаму пра гэта не кажу? Таму што гэта наўпрост датычыцца мяне і маіх дзяцей. Калі вы заўважылі, я часта казаў: нас будуць хістаць, гэта надоўга, яны ад нас не адстануць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі не ўдалася спроба арганізаваць спачатку мяцеж, а пасля гэтага «паўзучы пераварот». «Што цяпер яны могуць зрабіць? Ізноў гэта іх фраза: усё трымаецца на Лукашэнку, трэба знесці. Мая задача — зрабіць так: калі знясуць, каб у іх нічога не атрымалася», — сказаў ён.

«Другое, што наогул недапушчальна. Чаму я маўчаў: пра сябе, пра сям'ю, пра дзяцей не хочацца гаварыць. Але яны ўзяліся за дзяцей. У планах — захоп дзіцяці аднаго, другога, як атрымаецца. Пасадзім у склеп. Дарэчы, у Гомельскай вобласці склеп падрыхтавалі. Мы затрымалі групу, яны прызнаюць, што гэта ўсё планавалі, — паведаміў кіраўнік дзяржавы. — Затым мы выявілі работу відавочна замежных спецслужбаў... Мы выявілі іх жаданне з'явіцца ў Мінск і ўжо занятыя арганізацыяй замаху на Прэзідэнта і дзяцей».

Кіраўнік дзяржавы падзяліўся некаторымі падрабязнасцямі планаў па захопе ўладаў: «Мы іх захапілі ў Маскве, яны пабаяліся ехаць непасрэдна ў Мінск. З ЗША прыляцелі — агентура. Прозвішча яго — нейкі Зянковіч (гаворка пра Юрыя Зянковіча. — **«Зв.»**). Яны пабаяліся сюды ехаць пасля таго, як мы затрымалі некалькі груп, якія сюды зброю звезлі, ужо ў тайніку схавалі. Яны з'ехалі ў Маскву. І хто там яшчэ? Наш быў гэты — Фядута (Аляксандр Фядута. — **«Зв.»**). Потым сталі шырэй глядзець — Кастусёў (Рыгор Кастусёў. — **«Зв.»**) з'явіўся там, у меншай ступені. Ён у Маскве не быў, мы выйшлі на яго тут. І шэраг іншых. Яны ўжо сёння бачныя, таму мы можам пэўную інфармацыю агучыць».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у кіраўніцтва Расіі і непасрэдна ў ФСБ была накіравана просьба аказаць садзеянічанне ў арганізацыі затрымання ў Маскве адпаведных асоб. «Я папрасіў Прэзідэнта Расіі, і Тэртэль (старшыня КДБ Беларусі. — **«Зв.»**) — свайго калегу Аляксандра Бортнікава, ФСБ. І мы іх там узялі», — расказаў Прэзідэнт.

За словамі Аляксандра Лукашэнкі, яго здзіўляе, чаму амерыканцы сябе так паводзяць. «Бо паставіць задачу ліквідаваць Прэзідэнта, запомніце, не можа ніхто, акрамя вышэйшага палітычнага кіраўніцтва. Толькі яны, ніякія спецслужбы, — адзначыў беларускі лідар. — Я скажу больш. Я ўдзячны Пуціну. Калі ён размаўляў з Байдэнам (Прэзідэнт ЗША Джозэф Байдэн. — **«Зв.»**), ён яму задаў гэтае пытанне. Булькатанне — і ніводнага адказу! Уладзімір Уладзіміравіч мне патэлефанаваў, пра гэта сказаў, калі я з Азербайджана прыбыў».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка таксама заявіў журналістам, што мае намер у хуткім часе прыняць адно з самых прынцыповых рашэнняў за чвэрць стагоддзя прэзідэнцтва.

«У найбліжэйшы час, я прыняў рашэнне, мы яго цяпер фармалізуем, я агучу. Гэта будзе адно з прынцыповых маіх рашэнняў за чвэрць стагоддзя прэзідэнцтва. Гэта будзе вельмі сур'ёзна. Таму нават калі мяне не будзе, па-народнаму кажучы, «толькі праз мой труп», у іх нічога не атрымаецца. Я прыняў рашэнне. Цяпер мне трэба яго фармалізаваць. Гэта будзе хутчэй за ўсё дэкрэт Прэзідэнта», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Марыя ДАДАЛКА,
аг. Аляксандрыя.

НЯХАЙ РАСТУЦЬ НА РАДАСЦЬ!

Спікер верхняй палаты парламента Наталля КАЧАНАВА, старшыні Пастаянных камісій Савета Рэспублікі, сенатары, а таксама супрацоўнікі сакратарыята палаты прынялі актыўны ўдзел у рэспубліканскім суботніку.

Фота БелТА.

Яны працавалі на плошчы Багушэвіча, дзе ў гонар Года народнага адзінства заклалі алею, назву якой далі адпаведную: «Народнае адзінства».

Як паведамілі ў прэс-службе Савета Рэспублікі, было пасаджана больш за 30 розных дрэў. Сярод іх — яблыня ягадная, арэх маньчжурскі і іншыя.

Па словах Наталлі Качанавай, традыцыйныя рэспубліканскія суботнікі дазваляюць зрабіць нашу краіну яшчэ больш прыгожай, камфортнай і ўтульнай. Людзі працавалі з задавальненнем, і ёсць усе падставы спадзявацца на тое, што гэтыя дрэвы будуць расці і радаваць жыхароў горада. А ў тых, хто іх пасадзіў, застануцца прыемныя ўспаміны.

Леанід ТУГАРЫН.

КЛЯНОВАЯ АЛЕЯ АД ДЭПУТАТАЎ

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА сумесна з дэпутатамі і адміністрацыяй Ленінскага раёна Мінска, які якраз адзначае 70-годдзе, падчас рэспубліканскага суботніка заклалі алею клёнаў у Лошыцкім парку, паведаміла БелТА.

Фота БелТА.

«Суботнік — важнае і знакавае мерапрыемства. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў штогод прымаюць самы актыўны ўдзел, у тым ліку і сёння працуюць у розных рэгіёнах Беларусі. Група дэпутатаў ад горада Мінска працавала ў Лошыцкім парку. Гэта месца, якое захоўвае памяць пра воінаў Савецкай арміі, партызанаў, мірных жыхароў горада, якія загінулі пры яго вызваленні ў 1944 годзе. Важна, што сёння мы знаходзімся менавіта ў закладзеным памятную алею з шарападобных клёнаў. Думаю, што гэтая алея будзе добрай памяццю і ўдзячнасцю тым людзям, якія зрабілі ўсё, каб беларусы жылі ў спакойнай, мірнай і пасляхоўай краіне», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

Як адзначыў кіраўнік адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска Пётр Шостак, алея ў Лошыцкім парку закладзена ў гонар Года народнага адзінства. І яна будзе так звацца — Алеяй адзінства.

СТВАРАЛЬНЫ ХАРАКТАР ПРАЦЫ

Фота БелТА.

Суботнікі носяць стваральны характар. Такое меркаванне выказаў журналістам кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА, паведаміла БелТА.

«Сёння па ўсёй Беларусі працуюць людзі ўсіх узростаў: хтосьці добраўпарадкоўвае помнікі, хтосьці — тэрыторыі медыцынскіх установ, спартыўных комплексаў, іншыя наводзяць парадак у населеных пунктах, вёсках. Мы праехалі па вуліцах Лагойска — працуюць усе, людзі займаюцца добраўпарадкаваннем роднага горада. На прыкладзе такіх месцаў, як Лагойск, відаць, як прыгажэе з кожным годам уся наша краіна, — адзначыў Ігар Сергеенка. — Такія мерапрыемствы аб'ядноўваюць людзей, што асабліва актуальна ў Год народнага адзінства. Акрамя таго, ты разумееш, што прыносіш рэальную карысць свайй краіне».

Падчас рэспубліканскага суботніка з удзелам супрацоўнікаў Адміністрацыі Прэзідэнта на тэрыторыі Лагойскага лясгаса пасаджаны ляскія культуры на плошчы 1,7 га. «Мы таксама паглядзелі, як арганізавана тут работа, як растуць саджанцы, як дзейнічае тэхніка і чаго каштуе праца лесарубаў і работнікаў лясгаса», — расказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, падкрэсліўшы, што ляская прамысловасць — адзін з перспектыўных кірункаў развіцця краіны.

Падрабязнасці

«Цішыня», якой не далі грымнуць

Падчас рэспубліканскага суботніка ў Александрыі ў размове з журналістамі Прэзідэнт Беларусі расказаў пра спробу замаху на яго і яго сям'ю, які рыхтавалі агенты і замежныя спецслужбы. На словах кіраўніка краіны, у планах злачынцаў было забойства Прэзідэнта з мэтай правядзення мяцежу, а потым пераворату. Сярод арганізатараў — Юрый Зянковіч, Аляксандр Фядута і Рыгор Кастусёў. Двух з іх КДБ Беларусі прыма садзейнічанні ФСБ Расіі схапіла ў Маскве, дзе тыя абмяркоўвалі свае планы.

На тэлеканале АНТ у той жа дзень падчас вячэрняга выпуску навін паказалі спецыяльны сюжэт, дзе расказалі падрабязнасці падзей. Як заявіў у эфіры тэлеканала старшыня КДБ Іван Тэртэль, ведамства нядаўна завяршыла шматступенную спецаперацыю па прадухіленні ўзброенага мяцежу і ліквідацыі прадстаўнікоў улады. Падзеі былі запланаваны на чэрвень—ліпень гэтага года.

«Удзельнікі дадзенай групы дэтэлёва спланавалі і прыступілі да практычнай рэалізацыі задумы па фізічнай ліквідацыі Прэзідэнта Беларусі, членаў яго сям'і, арганізацыі ўзброенага бунту з мэтай захопу ўлады гвалтоўным шляхам», — сказаў Іван Тэртэль.

Паводле агучанай у сюжэце інфармацыі, узброены мяцеж у змоўшчыкаў атрымаў назву «Цішыня». У эфіры паказалі відэасустрэчы падазраваных асоб, падчас якіх абмяркоўвалася падрабязнасці магчымага злачынства.

Адным з удзельнікаў сустрэч быў Аляксандр Фядута. Галоўным арганізатарам перавароту названы Юрый Зянковіч, які заяўляў, што ў выпадку правалу за іх заступіцца Дзяржздепартамент ЗША. Сярод удзельнікаў сустрэч былі лідар партыі БНФ Рыгор Кастусёў, Ігар Макар і іншыя асобы.

ФСБ Расіі распаўсюдзіла відэа, на якім яны абмяркоўваюць ліквідацыю Прэзідэнта Беларусі і захоп будынкаў у Мінску. Кадры аператыўнай відэаздымкі былі паказаны ў эфіры праграмы «Весткі тыдня» з Дзмітрыем Кісялёвым на тэлеканале «Расія-1».

«Задача нумар адзін у нас — ліквідаваць самага галоўнага. Задача нумар два — блакіраваць унутраныя войскі, блакіраваць АМАП. Задача нумар тры — заняць некалькі сімвалічных аб'ектаў у цэнтры горада, у тым ліку радыёстанцыю і тэлебачанне, каб мы маглі зачытаць зварот. І пажадана заблакіраваць Мінск, каб не маглі падцягнуць знешнія войскі», — такі план агучыў Юрый Зянковіч на сустрэчы з іншымі падазронымі.

«Як мінімум 30 чалавек яшчэ (...) павінны быць інтэрнаваныя літаральна ў першую гадзіну. Выконваючы абавязкі прэм'ера айтаматычна становіцца выконваючым абавязкі прэзідэнта», — дадаў Аляксандр Фядута.

На даных ФСБ Расіі, Аляксандр Фядута і Юрый Зянковіч таксама планавалі прысвоіць маёмасць Аляксандра Лукашэнкі.

Заключная стадыя спецаперацыі КДБ прайшла ў Расіі пасля атрымання інфармацыі, што Юрый Зянковіч мае намер прыляцець з ЗША ў Маскву праз Польшчу для сустрэчы з саўдзельнікамі.

«У дачыненні да затрыманых Камітэтам дзяржаўнай бяспекі распачаты крымінальныя справы па адпаведных складах злачынстваў», — адзначыў Іван Тэртэль.

У сюжэце дадалі, што група падтрымлівала цесныя сувязі з тэрарыстычнымі фарміраваннямі, былі падрыхтаваныя як мінімум тры сцэнарыі захопу ўлады і з абавязковым сілавым уздзеяннем.

Затрыманні ў Маскве КДБ ажыццявіў пры падтрымцы ФСБ Расіі. Па інфармацыі Цэнтра грамадскіх сувязяў ФСБ, Юрый Зянковіч прыбыў у Маскву пасля кансультацый у ЗША і Польшчы для сустрэчы з прадстаўнікамі Узброеных Сіл Беларусі, каб пераканаць іх удзельнічаць у ваенным перавароце.

«Федэральнай службай бяспекі Расійскай Федэрацыі сумесна з Камітэтам дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь у выніку праведзенай спецаперацыі спынена супрацьпраўная дзейнасць Зянковіча Юрыя Леанідавіча, які мае падвойнае грамадзянства ЗША і Рэспублікі Беларусь, і грамадзяніна Рэспублікі Беларусь Фядуты Аляксандра Іосіфавіча, якія планавалі ажыццяўленне ваеннага перавароту ў Беларусі па адпрацаваным сцэнарыі «каляровых рэвалюцый» з прыцягненнем мясцовых і ўкраінскіх нацыяналістаў, а таксама фізічную ліквідацыю Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі», — падкрэслілі ў ФСБ.

У паведамленні заяўлена, што пасля змоўшчыкі былі перададзены беларускім партнёрам. У ФСБ адзначылі: пераварот планаваўся ў Мінску 9 мая падчас Парада Перамогі.

ПАРАДАК У АГУЛЬНЫМ ДОМЕ

Тысячы людзей працавалі на суботніку ва ўсіх рэгіёнах краіны

Зранку працоўны дэсант кіраўніцтва **Брэсцкага** аблвыканкама накіраваўся на будаўнічую пляцоўку медыцынскага комплексу ў Зарэчным мікрараёне абласнога цэнтра. Там, дзе размесяцца дарослая і дзіцячая паліклінікі на 500 і 600 наведванняў у змену адпаведна, а таксама жаночая кансультацыя на 190 прыёмаў у дзень, будаўнічыя работы ўступаюць у завяршальную стадыю. Увод у строй аб'екта чакаецца ў снежні, таму дапамога яшчэ адной брыгады аказалася дарэчы.

— Грошы, якія заробілі на суботніку, пойдуць на добраўпарадкаванне помнікаў, астатнія — на барацьбу з пандэміяй, — заўважыў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.**

Тым часам прадстаўнікі гарвыканкама на чале са **старшынёй Аляксандрам РАГАЧУКОМ** шчыравалі на добраўпарадкаванні вуліцы Зубачова ў раёне Брэсцкай крэпасці, а таксама ў парку Тысячагоддзя.

Не застаўся без увагі гарадской вертыкалі і сквер па вуліцы Валгарадскай.

У Баранавічах асноўныя работы па добраўпарадкаванні прайшлі ў гэты дзень у Парку культуры і адпачынку. У Пінску працавалі на набярэжнай ракі Піна. Работнікі Бярозаўскага райвыканкама, акрамя іншых аб'ектаў, прыводзілі ў парадак Вайцяшынскую сельскую бібліятэку. Моладзь Іванаўскага раёна праявіла ініцыятыву па расчыстцы меліярацыйнага канала па вуліцы Будаўнікоў у Іванаве.

Да мемарыяльнага комплексу партызанскай славы ва ўрочышчы «Хаваншчына» прыехалі з Івацэвіцкага райвыканкама. Пасля навядзення парадку ўдзельнікі суботніка ўшанавалі памяць герояў вайны. А кіраўніцтва Кобрынскага раёна шчыравала на ферме «Рыбна» ААТ «Кісялёўцы». Вялікі дэсант з райцэнтра працаваў на тэрыторыі гістарычнага аб'екта — былой сядзібы Рэйтанаў у вёсцы Грушаўка Ляхавіцкага раёна.

* * *

Жыхары **Віцебшчыны** дружна займаліся добраўпарадкаваннем на тэрыторыі мемарыялаў: «Прарыў» — ва Ушацкім раёне, «Урочышча Пяскі» — у Полацкім, «Вішанькі» — у Чашніцкім, воінскім пахаванні ў аграгарадку Копці Віцебскага раёна і іншых.

Кіраўнікі абласной вертыкалі высадзілі дрэвы (ліпы, бэз, каштаны) на віцебскай вуліцы Гагарына, дзе вядзецца маштабная рэканструкцыя. На жаль, тэпы дарожны аб'ект стаў даўгабудам, бо работы тут пачаліся ў 2005 годзе. **Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ** на суботніку агучыў даручэнне наладзіць рэканструкцыю ў тры змены. Здача ў эксплуатацыю фактычна будучага праспекта — ліпень.

* * *

Гродзенскія ўлады ўнеслі свае працоўную лепту па добраўпарадкаванні і будаўніцтве анкадыспансера, які будуецца ў Гродне. Гэта самая маштабная медыцынская будоўля ў вобласці.

Дарэчы, першая чарга дыспансера ў складзе радыялагічнага корпуса і ўсіх неабходных аб'ектаў інфраструктуры будзе ўведзена ў эксплуатацыю ўжо сёлета. Завяршыць будаўніцтва плануецца ў 2025 годзе. **Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК** пастаянна трымае гэты аб'ект на кантролі і падчас суботніка разам з абласнымі чыноўнікамі прыняў удзел у будаўнічых работах.

Падчас суботніка **міністр абароны Віктар ХРЭНІН** займаўся навядзеннем парадку на мемарыяльным комплексе ў Гродне. А вось прадстаўнікі ўпраўлення ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама на чале з выконваючым абавязкі начальніка Аляксандрам Шастайлам сваю працоўную вахту правялі на пасадцы лесу. Таксама супрацоўнікі УУС адналіі помнік загінулым міліцыянерам і мемарыяльную дошку.

* * *

На **Гомельшчыне** падчас рэспубліканскага суботніка працоўныя дсанты добраўпарадкоўвалі вуліцы гарадоў, пасёлкаў і вёсак, наводзілі парадак у парках і скверах, высякалі хмызнякі, прыбіралі тэрыторыі выт ворчых прадпрыемстваў, высаджвалі дрэвы. Так, у Гомелі супрацоўнікі абласнога аб'яднання прафсаюзаў высадзілі алею з 60 клёнаў.

Калектыў галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама выступіў з ініцыятывай добраўпарадкаваць тэрыторыю панскай сядзібы ў вёсцы Хальч Веткаўскага раёна. Ачысцілі тэрыторыю помніка архітэктуры ад расліннага смецця, склалі дровы, нарыхтаваныя для ацяплення.

На Брагіншчыне жыхары раёна актыўна наводзілі парадак на вуліцах: ачышчалі тратуары і абочыны, фарбавалі агароджы. У райцэнтры да правядзення рэспубліканскага суботніка прымеркавалі закладку новай алеі ў скверы памяці ахвяр катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Жыхары Мазыршчыны правялі суботнік на дваровых тэрыторыях маладых мікрараёнаў актыўнай жылпёвай забудовы. Сімвалічна, што ў гэты дзень ў сем'і мазыран прыйшла важная навіна: у адным з маладых мікрараёнаў райцэнтра свае дзверы расчыніў новы яслі-сад на 330 месцаў. **Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ,** які браў удзел у адкрыцці сацыальна значнага аб'екта, далучыўся да закладкі алеі «Планета дзяцінства» на тэрыторыі новай дашкольнай установы.

* * *

Адной з асноўных пляцовак рэспубліканскага суботніка ў **Магілёве** стала тэрыторыя фізкультурна-спартыўнага комплексу на вуліцы Фаціна. Па даручэнні Прэзідэнта гэты аб'ект атрымаў стабільнае фінансаванне і яго будаўніцтва вядзецца аператыўнымі тэмпамі.

— Жыхары Магілёўскай вобласці вельмі актыўна адгукнуліся на заклік ударна папрацаваць, — адзначыў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ.** — На суботнік выйшлі тысячы людзей. Пэўная частка сродкаў будзе накіравана на добраўпарадкаванне мемарыяльнага комплексу «Усакіна» ў Клічаўскім раёне. Суботнік яскрава паказвае, што мы моцныя ў сяброўстве і непераможныя ў справах.

У пасадцы маладых дрэўцаў прымаў удзел **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Леанід МАРТЫНЮК.**

— Любая праца, і тым больш такая, якая прыносіць задавальненне і карысць, радуе, — адзначыў ён. — Калі чалавек нешта робіць сваімі рукамі, ён гэта больш цэніць.

Наводзіць прыгажосць на прылеглай тэрыторыі фізкультурна-спартыўнага комплексу дапамагалі дэпутаты аблсавета і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь: Ірына Раінчык, Ігар Марзалюк і Вольга Петрашова.

— Традыцыйна прымаем удзел разам з органамі мясцовага самакіравання, — адзначыла **намеснік старшыні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Ірына РАІНЧЫК.** — Мы саджаем дрэвы, наводзім парадак на дваровых тэрыторыях, вокнах пачаткавых. Робім усё дзеля таго, каб Прыдняпроўскі край стаў яшчэ больш прыгожы.

* * *

Ва ўсіх раёнах **Мінскай вобласці** і горадзе Жодзіне прайшлі суботнікі, у якіх прынялі ўдзел людзі розных узростаў і прафесій: студэнты, школьнікі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, прамысловых прадпрыемстваў, мясцовых улад.

Супрацоўнікі Мінаблвыканкама на чале з яго **старшынёй Аляксандрам ТУРЧЫНЫМ** падчас рэспубліканскага суботніка працавалі ў Бярэзінскім раёне, дзе добраўпарадкоўвалі тэрыторыю каля помніка чырвонаармейцам. Менавіта тут, на беразе ракі Бярэзіны, нападалёку ад вёскі Міраслаўка, у 1941 годзе, на самым пачатку вайны, трынаццаць воінаў прынялі на сябе ўдар нямецкіх захопнікаў.

Аляксандр Турчын падкрэсліў, што нашчадкі павінны памятаць аб трагічных падзеях Вялікай Айчыннай вайны. Хоць гэты абеліск знаходзіцца далёка ад бойкіх дарог, а людзі прыходзяць сюды нячаста, каб ускласці кветкі, кожны з помнікаў павінен быць дагледжаны.

Дэпутаты Мінскага абласнога Савета, а таксама Смалявіцкага раёна разам са **старшынёй аблсавета Наталляй ЯКУБІЦКАЙ** добраўпарадкавалі тэрыторыю каля помніка ў вёсцы Прылепы Смалявіцкага раёна. Ён быў устаноўлены ў гонар 60 байцоў і 245 жыхароў вёсак на тэрыторыі калгаса імя У. І. Леніна, якія загінулі падчас вайны.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Маргарыта УШКЕВІЧ.
Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Нэлі ЗІГУЛЯ.
Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

• Каментарый у тэму

Інфармацыя пра дзяржаўны пераварот і фізічную ліквідацыю Прэзідэнта, якія рыхтаваліся, — яскравае сведчанне таго, што Беларусь стала для калектыўнага Захаду парашкодай у іх стратэгічных планах па разбурэнні славянскага



свету і знішчэння Расіі. Такім меркаваннем з карэспандэнтам БелТА падзяліўся **кандыдат філасофскіх навук загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН Мікалай ШЧОКІН.**

«Відавочна, што дзеянні спецслужбаў і палітычных эліт Захаду ідуць у рэчышчы рэалізацыі вядомай чатырохступеньчатай мадэлі гібрыдных вайны. Безапеляцыйны ціск на Беларусь у поствыбарчы перыяд не прынёс выніку. Пятая калона і збеглыя не змаглі адпрацаваць у іх укладзеныя грошы. Беларусь аказалася больш устойлівай і маналіт най перад пагрозай, чым меркавалі на Захадзе. Зразумела, падобныя акцыі па фізічнай ліквідацыі дзяржкіраўнікоў выконваюцца толькі па прамым указанні палітычных вярхоў замежных дзяржаў. Мы сутыкнуліся з дзяржаўным тэрарызмам з боку шэрагу заходніх краін і іх лідараў. Перакананы: на чарзе быў лідар Расіі — Уладзімір Пуцін», — падкрэсліў Мікалай Шчокін.

Паводле яго слоў, у ЗША не засталося канструктыўных варыянтаў для захавання свайй гегемоніі і прасоўвання ваенна-каланіяльнай палітыкі. «Любы палітычны працэс, а ўжо тым больш па зняважэнні законнай улады, мае сваю логіку: нязменна зъязджаюць ёсць пункт адліку і пункт завяршэння. Будзем шчырыя: Беларусі абвешчана вайна, якая ў свайй гібрыдной мадэлі нацэлена на перспектывы прамога ваеннага ўмяшання з дзяржаўным пераваротам, фізічным знішчэннем Прэзідэнта і кіраўнічай вертыкалі, захопам адміністрацыйных будынкаў пад куратарствам і па метадычных спецслужбаў Захаду», — адзначыў эксперт.

Мікалай Шчокін лічыць, што сёння варта мабілізаваць кіраўнічую (ідэалагічную) вертыкаль і засяродзіць увагу на кадравай палітыцы, устойлівасці сістэмы дзяржаўнага кіравання і эканамічнай эфектыўнасці.

* * *



Калектыўны Захад першапачаткова досыць негатыўна ставіўся да Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з-за яго адмовы ісці ў сваёй палітыцы ў «заходнім кірунку» — з гэтым і звязаны спробы ліквідацыі кіраўніка дзяржавы, лічыць **эксперт грамадскага аб'яднання «Беларусь Русь» Пётр ПЯТРОЎСКІ.** Яго словы перадае РІА «Новости».

«Звязана гэта з тым, што Лукашэнка адмовіўся ісці па заходнім вектары развіцця, адмовіўся рабіць шкавую тэрапію, навязваць прываствацыю і не пайшоў па шляху еўраатлантычнай інтэграцыі. Усё гэта стала прычынай таго, што практычна з самага пачатку калектыўны Захад праводзіў палітыку адхілення Прэзідэнта Беларусі ад улады, фінансавання апазіцыі, арганізацыі розных формаў Майдана, пратэстаў і інш дзеянняў, якія б спрыялі змене ўлады ў Беларусі. Гэта значыць, тут чыстай вады геапалітыка, па-першае, і, па-другое, іміджавы складнік», — сказаў Пётр Пятроўскі.

Паводле яго слоў, Беларусь дэманструе альтэрнатыву развіцця заходняму вектару, паказвае, што можна «без Захаду, без так званых структурных псеўдарэформ жыць і развівацца». Эксперт мяркуе, што на Захадзе Аляксандра Лукашэнку ўспрымаюць шмат у чым як «крыніцу дэманстрацыі альтэрнатыўнага шляху развіцця, што парушае жаданую мясцовымі элітамі манаполію ўласнай мадэлі існавання».

* * *

Міжнародную сітуацыю вакол Беларусі ў рэчышчы апошніх сенсацыйных паведамленняў «Звяздзе» пракаментаваў **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ.**



«Падзеі, якія адбыліся ў Беларусі, з'яўляюцца паказчыкам таго, да чаго прыводзіць сусветную супольнасць няўхільнае размываніе фундаментальных прынцыпаў міжнароднага права. Фактычна гадоў 20 таму ў звычайную практыку ўвайшлі санкцыі супраць суверэнных дзяржаў, умяшальніцтва ва ўнутраныя справы краін пад відам прыгожых, але скажонных лозунгаў пра абарону дэмакратыі і свабоды. Наступным крокам сталі «каляровыя рэвалюцыі», што ўжо знаменавалі адмову ад павагі да суверэнітэту дзяржаў і іх права на самастойнае вызначэнне шляху развіцця», — мяркуе дэпутат.

Паводле яго слоў, гэтыя з'явы сталі галоўнай ідэяй новага, радыкальнага этапу глабалізацыі, у рамках якой нацыянальныя дзяржавы паніжэны былі быць знішчаны цалкам. Рэспубліка Беларусь працівілася такім зменам. «Мы заўсёды казалі, што выступаем за міжнародную супольнасць, якая б базіравалася на каштоўнасцях незалежнасці, канструктыўным узаемадзеянні суверэнных дзяржаў. Мы казалі аб праве выбару для кожнай краіны свайго шляху развіцця. Мы казалі: фундаментальны прынцып Статута ААН мае на ўвазе роўнасць усіх дзяржаў незалежна ад іх ваеннага, эканамічнага патэнцыялу. Такая пазіцыя заўсёды падтрымлівалася большасцю краін, але дзяржавы, якія абаранялі аднапалярны глабальны свет, ніколі не хацелі гэтага чуць», — дадае парламентарый. Андрэй Савіных адзначае, што, кажучы прыгожым лозунгі, буйныя дзяржавы, тым не менш, кіраваліся прынцыпамі real politik, навязвалі іншым краінам неэквівалентны абмен, стваралі больш высокі ўзровень жыцця ў сябе за кошт разграблення краін перыферый.

«Сёння мы маем плады гэтага прававога нігілізму ў міжнародным маштабе і бачым, як гэтыя дзеянні перараджаюцца ў злачынныя загаворы і падрыўныя аперацыі», — рэзюмуе дэпутат.

Музейны складнік турызму

У Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы прайшоў метадычны семінар «Роля літаратурных музеяў у развіцці ўнутранага турызму».

Мерапрыемства, арганізаванае Нацыянальным агенцтвам па турызме Рэспублікі Беларусь, мае сапраўды знакавы характар. Прадстаўнікі турыстычнай і музейнай сфер сабраліся на семінары, каб праз прэзентацыю пазнаёміцца з экспазіцыямі Купалаўскага музея, адкрыць для сябе новыя формы работы з наведвальнікамі, стаць удзельнікамі інтэрактыўнай экскурсіі з выкарыстаннем ІТ-тэхналогій. А таксама атрымалі задавальненне ад дэманстрацыі музейна-педагагічнай праграмы «Вячоркі», узялі ўдзел у квэсце «У пошуках папараць-кветкі». Падсумаваў работу семінара круглы стол па актуальных праблемах суладдзя музейнай справы і развіцця ўнутранага турызму.

— Такія семінары павінны стаць сістэмным складнікам нашай метадычнай работы дзеля пашырэння выкарыстання музейнага патэнцыялу для росту турыстычных паслуг у краіне, — адзначыў **дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме Рэспублікі Беларусь Павел САПОЦЬКА.** — У Беларусі шмат літаратурных музеяў. Яны прысвечаны жыццю і творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Петруся Броўкі, Максіма Багдановіча... Мяркую, што арганізатары экскурсійна-турыстычнай работы павінны звярнуць увагу і на грамадскія, школьныя літаратурна-краязнаўчыя музеі.

Сяргей ШЫЧКО.

А вы бачылі?

Урок сучаснай гісторыі

Супрацоўнікі і курсанты Акадэміі МУС наведалі Палац Незалежнасці

Палац Незалежнасці зноў адкрыў свае дзверы для ўсіх ахвотных бліжэй пазнаёміцца з сімваламі беларускага суверэнітэту. У нядзелю, 18 красавіка, Рэзідэнцыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь наведалі супрацоўнікі Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў з сем'ямі і курсанты першага курса. Экскурсіі ў Палац Незалежнасці — ужо традыцыя, закладзеная кіраўніком дзяржавы. У першай палове дня тут вырашаюцца важныя палітычныя пытанні, а затым з палацам знаёмяцца людзі з усіх куткоў краіны. Дарэчы, экскурсійныя групы Палац Незалежнасці прымае з самага адкрыцця ў 2013 годзе.

Для курсантаў-першакурснікаў Акадэміі МУС наведаванне Рэзідэнцыі Прэзідэнта стала своеасаблівай падзякай за выдатную вучобу і службу. Васіль Лабашэвіч, намеснік старшыні курсаў факультэта міліцыі Акадэміі МУС падкрэсліў, што такая экскурсія — урок сучаснай гісторыі, якую будучыня міліцыянеры павінны ведаць і шанаваць. А самога афіцэра найбольш уразіла, што амаль усё ў Палацы Незалежнасці зроблена беларускімі спецыялістамі з айчынных матэрыялаў.

Экскурсанты наведалі залы, дзе праходзяць важныя палітычныя і ўрачыстыя падзеі рэспубліканскага і міжнароднага маштабу. Вялікую цікавасць выклікала Зялёная зала, дзе ў 2015 годзе праходзіў саміт «нармандскай чацвёркі». Госці Палаца на свае вочы ўбачылі падарункі, якія кіраўнік дзяржавы атрымаў ад партнёраў і сяброў. Як прызналіся ўдзельнікі экскурсіі, яны даўно хацелі наведаць Рэзідэнцыю Прэзідэнта.

«Я хацеў пабываць у Палацы Незалежнасці. Мне здаецца, гэта жаданне кожнага беларуса, бо Палац — галоўнае збудаванне нашай краіны. І цікава ўбачыць, як тут усё на самай справе. Вельмі ўразіла Галоўная зала — светлае, прасторнае памяшканне. Адразу пазнаў Камінную залу, бо часта бачу яе ў навінах. Кожны, хто цікавіцца імі, сочыць за палітыкай, абавязкова пазнае хоць бы адну залу і будзе рады яе ўбачыць», — падкрэсліў **Дзмітрый КЛІМЯНКОЎ, курсант факультэта міліцыі Акадэміі МУС.**

У інтэр'ерах Палаца Незалежнасці кожны госць знайшоў самае адметнае для сябе — цікавыя рэчы, дэкор, карціны. З вялікай цікавасцю госці слухалі гісторыі пра мерапрыемствы вышэйшага ўзроўню, якія тут адбываліся. Па іх словах, гэта адчуваецца нават па атмасферы і энергетыцы комплексу. «Я не чакаў такога маштабу, бо зусім розныя рэчы — бачыць Палац па тэлевізары ці ў інтэрнэце і ўжывую. Уражаюць такая прастора і ўбранне. Захапляе прагажосць гэтай пабудовы і, вядома, адчуваецца энергетыка. Я лічу, тут абавязаны пабываць кожны, хто лічыць сябе беларусам і хто любіць нашу краіну», — падзяліўся **курсант Сяргей ЗАБЛОЦКІ.**

Для некаторых курсантаў Акадэміі МУС наведаванне Палаца Незалежнасці стала не толькі ўрокам сучаснай гісторыі Беларусі, а і першай прыступкай на шляху да свайго мэты. Так, **Ілья МАСАЛЬСКІ** прызнаўся, што мае на мэце праз некалькі гадоў прыйсці ў Палац Незалежнасці не на экскурсію, а на работу: «Я не тое што марыў наведаць Палац Незалежнасці, я гэтага жадаў. Кожны беларус абавязаны тут пабываць, бо Палац — гэта галоўная славутасць нашай краіны. У мяне ёсць мэта ў будучыні працаваць у Палацы Незалежнасці. Я цяпер вучуся ў Акадэміі МУС, у будучыні хацелася б стаць і міністрам. Дрэнны той салдат, які не марыць стаць генералам».

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Надвор'е

Што за «халодныя» справы?

Няўжо ў пятніцу зноў мокры снег...

Здавалася б, другая палова красавіка павінна быць камфортнай на ўмовы надвор'я... А вось і не заўсёды так, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, а следам заяўляюць, што ў канцы тыдня ў нашай краіне і зусім пахаладае.

Ужо сёння атмасферны ціск пачне падаць, а надвор'е будзе вызначаць нябстойлівая паветраная маса. Павялічыцца і ўшчыльніцца воблачнасць. Удзень у многіх раёнах Беларусі пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. У дзённыя гадзіны ў асобных раёнах магчымы навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе 7—13 цяпла, па захадзе — да плюс 15 градусаў.

Заўтра, у першы дзень трэцяй дэкады красавіка, атмасферны ціск працягне падаць. Захаваецца воблачнасць. Ночы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ночы і раніцай у асобных раёнах магчымы навальніцы. Вецер прагназуецца паўночна-заходні, заходні ўмераны, у дзённыя гадзіны пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 градусаў. Удзень будзе 10—16 цяпла, але па паўночным усходзе, дзе прагназуюцца шчыльныя аблокі, будзе ўсяго ад 8 да 9 градусаў цяпла.

І ў чацвер характар надвор'я істотна не зменіцца, толькі ўдзень пры праходжанні атмасферага фронту ўзмоцніцца паўднёва-заходні вецер. Ночы месцамі, удзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ночы і раніцай у асобных раёнах чакаецца туман. Удзень месцамі прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 1 цяпла да 7 градусаў вышэй за нуль, удзень — 10—17 цяпла. Характэрна, што такі тэмпературны фон на 1—4 градусы вышэйшы за кліматычную норму для гэтых красавіцкіх дзён. Але на гэтым добрыя навіны заканчваюцца.

У пятніцу прыйдзе халодны атмасферны фронт, які ссоўваецца з акваторыі Балтыйскага мора праз Беларусь. Пахаладае, павялічыцца і ўшчыльніцца воблачнасць. Вецер прагназуецца заходні ўмераны. На большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, (увага!) па паўночным захадзе — з мокрым снегам. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 цяпла, удзень — ад плюс 6 градусаў да 13 градусаў вышэй за нуль.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у наступныя выхадныя чакаецца адносна халоднае і няўстойлівае надвор'е. Ночы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла, а ўдзень чакаецца ўсяго толькі 5—11 градусаў вышэй за нуль. Можа, дарма я ўсё-такі сваю куртачку на «рыбіным пуху» з шафы дастаў?

Сяргей КУРКАЧ.

Сустрэчы

Фея, што дорыць казкі

Дзіцячая пісьменніца Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ пазнаёміла гродзенскіх школьнікаў з кнігамі, якія выйшлі ў Выдавецкім доме «Звязда»

Гэта выданні незвычайных фарматаў: кніга-перакрутка, кніга-гаджэт, кніга-квэст... Некаторыя з іх убачылі свет у гэтым годзе. Прэзентацыя стала для дзясяткаў гродзенскіх школ сапраўднага міні-спектаклем з казачнай феяй, незвычайным перснажам Вухуцікам і падарожжам у дзівосны кніжны свет.

Мерапрыемства прайшло ў гарадской дзіцячай бібліятэцы і гродзенскай гімназіі № 1. Школьнікі з задавальненнем дзялліліся ўражаннямі ад сустрэчы з сапраўднай пісьменніцай. Многім спадабаўся інтэрактыўны фармат, які выбрала для размовы са сваімі слухачамі Кацярына Хадасевіч-Лісавая.

У дзіцячым аддзеле Гродзенскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя А. Макаёнка нямала літаратуры Выдавецкага дома.

— Мы часта заказваем кнігі Выдавецкага дома «Звязда», і яны карыстаюцца вельмі шырокім попытам. Выданні даволі цікавыя, яркія, яны не проста стаяць у нас на паліцах, а актыўна чытаюцца. Вось можна на выстаўцы ўбачыць гэтыя кніжкі і колькі чалавек іх прачытала. Як бачым, дзясяткі, — расказвае **загадчыца аддзела Тамара ХЛАМКО.** — Зараз даволі часта бацькі пытаюць кніжкі на беларускай мове. Я сама іх чытаю з задавальненнем, таму рэкамендую і бацькам.

Як аказалася, дзякуючы багатай фантазіі. Гэтым жыве і пісьменніца Кацярына Хадасевіч-Лісавая. Мабыць, таму абрала для сябе вобраз казачнай феі ў залатым блёскучым адзенні. Да таго ж работа ў школе дапамагае стварацъ цікавых персанажаў і фантастычныя сюжэты.

— Я выбрала вобраз чараўніцы, якая стварае казкі, прыносіць іх дзецям, бо іх трэба зацікавіць, у тым ліку і знешнім выглядам. Але гэта не проста фея, а кніжная фея, бо такая мая спецыяльнасць — фея, якая стварае кніжкі, — тлумачыць свой імідж Кацярына Хадасевіч-Лісавая.

- оцениваем общее представление годовой финансовой отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также того, обеспечивает ли годовая финансовая отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводим до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.

Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении (кроме тех случаев, когда раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят пользу от ее раскрытия).

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0000738 от 14 мая 2003 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудитор

Кропка на карце

АБ ЧЫМ БАЛІЦЬ «СЭРЦА КРАІНЫ»?

Падарожжа ў вёску Антанова, геаграфічны цэнтр Беларусі

Вёска Антанова, цэнтр Беларусі.

Калі месцазнаходжанне цэнтра Еўропы неадназначнае і выклікае спрэчкі (граніцы Еўропы да вядомай ступені ўмоўныя, і па розных сістэмах вылічэнняў ее цэнтр прыпадае на Беларусь, Украіну, Літву, Польшчу, Венгрыю, Чэхію, Славакію і г. д. — на права «валодаць» цэнтрам Еўропы зараз прэтэндуе 11 краін), то з цэнтрам Беларусі ўсё прасцей. Хоць і тут не абышлося без спрэчак.

Вылічыць геаграфічны цэнтр рэспублікі ў 1995 годзе ўзялося спецыялісты 82-й экспедыцыі аб'яднання «Белгеадэзія» і кампаніі «Аэрагеакарт». Вылічэнні вялося па карце маштабу 1: 200 000, атрыманай са штучнага спадарожніка Зямлі. Па выніках вымярэнняў першапачатковых варыянтаў было 18. Але ў рэшце рэшт навукоўцы сышліся на тым, што цэнтр нашай краіны знаходзіцца ў вёсцы Антанова Навасёлкаўскага сельсавета Пухавіцкага раёна, усяго толькі за 67 кіламетраў на паўднёвы ўсход ад Мінска, зусім недалёка ад Мар'інай Горкі.

АНТАНОВА

У вёсачку Антанова — менавіта так, націск на перадапошнім складзе — вядзе траская грунтоўка. З'язджаеш з трасы і трапляеш на «пральную дошку» працягласцю кіламетраў сем-восем. На ўяздзе стаіць указальнік, на якім напісана «Антонава».

— Так, там няправільна напісана. Правільна — Антанова. Трэба знак памяняць, — кажа мне па тэлефоне **в. а. старшыні Навасёлкаўскага сельсавета Вольга КАМАРОЎСКАЯ.** — Вы прыехалі туды, куды вам трэба.

Навігатар згодны з Вольгай. Ён пацвердзіў «Вы прыехалі» якраз пасярод вясковай вуліцы. На гук матора з брамкі выходзіць мясцовы жыхар Аляксандр — даведацца, з чым завіталі. Аляксандр радыі пагутарыць з новым чалавекам.

— Сельсавет у Навасёлках, вунь там вёска. А гэта Антанова, цэнтр Беларусі, — кажа ён. — А знак вы-ўнь стаіць, гэта трэба круг аб'язджаць і па полі піляць.

— Ну, як жыццё ў цэнтры Беларусі?

— Ды так... — разводзіць рукамі суразмоўца.

Геаграфічны цэнтр Беларусі — гэта кропка з канкрэтнымі каардынатамі: шырата 53°31 '50,76»; даўгата 28°2 '38,00». Прыходзіцца гэтая кропка на адзін з дамоў гаспадыні, праўда, ужо няма ў жывых.

— Бабулька была трактарысткай у калгасе, чацвёра дзяцей выгадавала. Такая была цудоўная бабулечка — акуратніца, вышывальшчыца! Госця ніколі нікуды не выпускіць, пакуль не накорміць і чарку не наліе. Гадоў шэсць, як памерла, — узгадваюць пра яе мясцовыя жанчыны.

Геадэзічны знак аднеслі ад дома метраў на пяцьсот і паставілі ў чыстым полі. Устаноўка знака адбылася 31 мая 1996 года.

Турысты любяць прыгожыя краявіды, архітэктурныя незвычайнасці і «абломкі даўніны». Але ёсць і яшчэ «замануху»: напрыклад, цікавыя геаграфічныя кропкі (усялякія нулявыя кіламетры, межы мацерыкоў, цэнтры таго ці іншага). Там ставяць адпаведныя знакі, каля якіх зручна фатаграфаваць, і вакол, па ідэі, павінны ўзнікнуць аб'екты турыстычнага сэрвісу. Гэтага ў вёсцы Антанова не адбылося. Хоць знак стаіць. Стандартны геадэзічны знак: піраміда з чатырох металічных брусоў вышынёй у некалькі метраў. А ўнутры полай канструкцыі — каменная пліта, дзе уласна, і напісана пра цэнтр Беларусі.

МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ

Антанова нельга назваць старажытным населеным пунктам: вёсцы крыху больш за 90 гадоў. Дакладней ніхто не скажа.

— У мінулым годзе мы рабілі свята вёскі Хацешава, — распавядае дырэктар Борскага сельскага Дома культуры Таццяна Мазанік. — Хацешава летась 90 гадоў было. А Антанова крыху старэйшае.

Вёска Бор — за паўтара кіламетра ад Антанова. Там і дарога лепшая (ёсць нават участак асфальту), і выгоды цывілізацыі — крама, лазня, Дом культуры. Хто быў у Антанове маладзейшы і не з'ехаў у горад, перабраліся ў Бор.

— Прапісана ў Антанове шмат, але людзі там не жывуць. Аджывае вёска, — кажа Таццяна.

Па ўспамінах старажылаў, калісьці ў гэтых мясцінах быў вялікі пасёлак. Жылі вельмі шчыльна: суседавы, зразумела, былі драўлянымі, і калі здараўся пажар, агонь хутка перакідваўся на суседнія дамы. Перад калгасамі пасёлак вырашылі рассяляць. Нарабілі ажно дзевяць новых паселішчаў, адно з якіх атрымала назву Антанова.

Версій паходжання назвы дзве. Паводле адной, даўней гэтымі землямі валодаў пан Антаноўскі — адсюль і назва. Па іншай, назва вёскі паходзіць ад назвы яблыкаў — антаноўкі. Тут заўсёды быў яблычны край — дом без саду ўявіць было немагчыма. Па дарозе з Мінска ў Антанова пераязджаеш рэчку Цітаўка — таксама названую ў гонар знакамітага народнага сорту яблыкаў. А ў гэтых месцах асабліва добра пладаносіць якраз антонаўка. У 1940-х насупраць вёскі студэнты Мар'інагорскага тэхнікума высадзілі 40 саджанцаў яблынь, распавядаюць мясцовыя жыхары. Асабліва смачным урадзіўся не белы наліў, а антонаўка.

Яшчэ гадоў 10—15 таму восенню вёска патанала ў сакавітых вялізарных яблыках. Зараз яблыні пастарэлі разам з гаспадарамі. А ў вёсцы, дзе на 1.01.2002 было 32 двары і 60 жыхароў, у 2009 — 43 жыхары, сёння наўрад ці набярэцца 20 чалавек.

Росквіт вёсачка перажывала ў складзе калгаса «Іскра», распавялі мне. Была тут свінаферма і малочна-таварная ферма. Свінаферма засталася, яна цяпер «у прыватніка».

— Зараз гэта свінакомплекс, там амаль усе мясцовыя працуюць.

Сёй-той з жыхароў навакольных вёсак працуе і «ў сірыйцаў». Ёсць тут непадалёк маленькая вытворчасць — пячэнне пякуць. Уласнікі — грамадзяне Сірыі, а работнікі — мясцовыя.

— Чалавек сем нашых там працуе, з навакольных вёсак. Большасць работнікаў прыязджаюць з Мар'інай Горкі. Там патрэбны маладыя работнікі, а ў нас моладзі мала, не хоча заставацца. Пячэнне смачнае, калі ў каго здаровы страўнік. Прадаецца і ў Мар'інай горцы ў магазінах.

У вёсцы Бор ёсць школа-дзевяцігодка, дзе вучыцца дзятва з усіх навакольных вёсак, — усяго 65 чалавек.

— Дзеці з'язджаюць паступаць і не вяртаюцца. Калі б была нейкая вытворчасць... Людзям работа патрэбна. Гаварылі: геаграфічны цэнтр Беларусі зробяць — санаторый пабудуюць, вось была б людзям работа.

Зрэшты, хтосьці ў Антанова ўсё ж вяртаецца.

— Нават купляюць хаты, бо тут электрычка недалёка.

Але звычайна гэта людзі, якія ўступілі ў спадчыну і жывуць тут толькі ў цёплы сезон, а зімаваць з'язджаюць у горад. Іх тут называюць дачнікамі. Аляксандр таксама вярнуўся ў родныя мясціны з Мінска, але ён не дачнік — у Антанове жыве і зімой.

— Я ўжо пенсіянер, 66 гадоў мне. Працаваў у Мінску: дарожнік. Кальцавую мы рабілі, абслугоўвалі дарогі па ўсёй Беларусі. Гэта дом маёй цешчы. Выйшаў на пенсію — вырашыў тут жыць.

Падыходзіць сусед майго суразмоўцы і моўчкі прыцягвае мне пячэнне — частуе госця. Прадстаўляецца: «Віктар». Пячэнне, мабыць, мясцовай вытворчасці — тое самае, што «сірыйцы пякуць».

— Тут раней непадалёк ягаднік быў, з Мінска ў ягады людзі ехалі. А цяпер баяцца сюды і ехаць: як ехаць без дарог? Вы ў сельсавеце будзеце, я чуў, дык спытайце іх па дарогу.

ДАРОГА

Яна ў Антанове і ваколіцах — боль мясцовых жыхароў.

— Да суседняй вёскі два кіламетры, ну, можа, тры, і не дабрацца ні восенню, ні вясной. Цэнтр Беларусі, а дарогу два кіламетры высыпаць не могуць. Калі трэба ехаць у тую вёску — трэба круг даваць, на Мар'іну Горку, на Рудзенск і сюды толькі ў вёску прыехаць. Калі каму дапамагчы ці што, «хуткая» не прыйшла б. У сельсавеце спыталі — яны кажуць, у вас гравійка ёсць...

Гравійка, як аказалася, ідзе ў бок, на Хацешава. А прамая дарога на вёску Горкі, на Дрычын ад Антанова была раней, але цяпер яе няма — з-за гэтага і праблема.

— Шляху ўжо няма гадоў трыццаць. Трыццаць гадоў мы пакутуем і пастаянна звяртаемся, і ўсё нам ідуць адмовы. Сказалі, гэта не па плане, гэта раней дарога была, а цяпер яе няма і не будзе, — распавядае Фаіна Рыгораўна.

Яе хата апошняя на вясковай вуліцы, і жанчына прапануе правесці і паказаць, дзе была дарога і дзе яе цяпер няма.

— Я тут замужам 43 гады і пастаянна езджу гэтым напрамкам. Вось глядзіце, зараз гравійка паверне на Хацешава, яна нам не цікавая. А тая дарога, што была раней, яна прама ішла, літаральна некалькі кіламетраў — і выязджаеш на трасу. Нам калі на Мінск ехаць, трэба аб'язджаць праз Навасёлкі, а так прамая дарога была на Дрычын.

— А калі яна была, гэтая дарога?

— Калі я замуж ішла, па ёй ездзіла. Гадоў 30, як яна зарасла. У 1980-я была, а ў 1990-я яе не стала.

Установка геадэзічнага знака «Цэнтр Беларусі» адбылася 31 мая 1996 года.

Мы з суседзямі падпісы збіралі, каб дарогу вярнуць, але нічога не выйшла. Так што цяпер мае дзеці, калі ездзяць да нас, аб'язджаюць лішнія кіламетры праз Мар'іну Горку.

— Па той дарозе ў 1990-я танкі прайшлі, — кажа Аляксандр. — Вучэнні былі, марш-кідок з Мар'інай Горкі на Печы. Засталіся адны ямы. Пасля таго дарогу так і закінулі.

Ускрай поля бягуць удалячынь каляіны ад колаў. Гэта самароблая дарога мясцовых жыхароў.

— Гаспадарка арэ і не заворвае. Зімой і вясной мы тут не ездзім. Потым хтосьці адзін каляіну зробіць, тады і ўсе астатнія ездуць. І так мучымся ўсё жыццё. Мая родная вёска — Маргі, і я толькі праз Навасёлкі, кругом, у яе тэлефон, калі на машыне. Могілкі там, бацькі мае ляжаць, — тлумачыць Фаіна Рыгораўна.

— Гэта сельсагруддзі, там не належыць быць дарозе, — каментуе сітуацыю в. а. старшыні Навасёлкаўскага сельсавета Вольга Камароўская. — Было пра гэта пытанне, паглядзелі, што не павінна быць там дарога. Ёсць мэты сельсагруддзі, мы ж іх не перашкоўлі.

— Але ж людзі скардзяцца і на якасць гравійкі...

— Мы ж у вёсцы жывём. Робім заяўкі пастаянна, калі людзі звяртаюцца, пішам лісты ў ДРБУ альбо ЖКГ, на чыім баланс дарога, яны прыязджаюць, падсыпаюць, рамонт робяць. Вядома, зімой і калі паводка, такога хапае, нават у Мар'інай Горцы: асфальт жа ўсюды не пакладзеш, гэта ўсё фінансаванне. Я таксама падвесну раз на паўгода ў машыне мяняю.

ЗНАК

— Ой, вы туды не даедзеце, ісці трэба. Унук на канікулы прыязджаў, хацеў знак гэты сфатаграфаваць, дык я забылася спытаць, ці дабраўся ён да яго.

Размова зноў зварочвае на тэму дарог. Але ў пытанні мэтазгоднасці дарогі да знака «Цэнтр Беларусі» ў мясцовых жыхароў няма аднадушнасці:

— Шлях зрабілі б да знака гэтага: кожны год усё роўна хто-небудзь прыязджае.

— Ой, ды хто там будзе ездзіць, аб чым ты кажаш...

Праводзіць да цэнтра Беларусі («Самі вы наўрад ці знойдзеце!») згаджаюцца **дырэктар Борскага сельскага Дома культуры Таццяна МАЗАНІК і мастацкі кіраўнік Наталля КРЫВАШЭЙ.**

Каб дабрацца да знака, зварочваеш з гравійкі і ідзеш пешшу — доўга, хвілін дваццаць — наўпрост па засеяным полі. Узімку дайсці да знака праблематычна: перашкодзяць снежныя гурбы. Увесну — можна, калі не баішся выпэшчацца па калена. Лепш за ўсё для падарожжа ў цэнтр Беларусі выбіраць лета.

— Вы, вядома, не ў той час прыехалі. Тут летам добра.

— Але летам па жыце прыйшлося б ісці да знака — блыталіся б у каласах.

Далёка напарадзе з туману вынырваюць імклівыя цені. Аказалася, бадзяжныя сабакі. «Можа, ваўкі?» — узіраюцца жанчыны. «Не, сабакі».

Знак выглядае нявесела: чорная металічная канструкцыя і чорная гранітная пліта пад ёй, якая нагадвае надмагілле. Мясцовыя жыхары распавялі, што гэта ўжо трэцяя пліта — яе, у першыя гады як паставілі, два разы краліі...

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, фота аўтара.

Жыллё маё

КІРАВАЦЬ — ЗНАЧЫЦЬ РАЗУМЕЦЬ І РАЗМАЎЛЯЦЬ

Даглядаць дамы павінны прафесіяналы

Хуткія змены на рынку будаўніцтва і абслугоўвання жылля не заўсёды дазваляюць своечасова рыхтаваць патрэбных спецыялістаў. Яшчэ больш адстае ад жыццёвых рэалій заканадаўства. Існуе і непадрыхтаванасць грамадскіх служачых і насельніцтва да ўспрымання рэчаіснасці і сучасных патрабаванняў да жылля. Аднак у будучыню трэба глядзець ужо сёння, і задача прафесійнай супольнасці тых, хто абслугоўвае жыллё, — падказваць, што і як у жыллёвай сферы трэба рабіць найперш. Кіраваць дамамі павінны людзі выключна прафесійна падрыхтаваныя, лічаць эксперты. Яны распавялі, што робіцца ў нашай і іншых краінах для падрыхтоўкі спецыялістаў па прафесійным кіраванні жыллём, і чаму яны ўвогуле патрэбныя.

Цэнтр кампетэнцый

Прафесійнае кіраванне павінна базіравацца на сістэме падрыхтоўкі кіраўнікоў, якая закладваецца ў краіне, а таксама на дакладна прапісаных правілах. З жыллёвай сферы дзяржава ніколі не павінна выходзіць, бо гэта адзін з галоўных складнікаў жыццядзейнасці грамадства. Пры гэтым самакіраванне і самаабучанне — таксама магчымасць, аднак дадатковая, а не першаградная, лічаць эксперты семінара праекта FpB-19018 «Распрацоўка інструментаў узаемадзеяння і міжгаліновага супрацоўніцтва для прафесійнага кіравання нерухомасцю», які адбыўся ў Мінску.

Нямецкі вопыт санацыі жылля — напэўна, адзін з самых эфектыўных у свеце, і яго (у адаптаваным да нашых умоў выглядзе) варта пераймаць у Беларусі. Пытанне толькі ў тым, хто будзе гэта рабіць і займацца адпаведнымі навыкоўмі даследаваннямі, хто будзе рыхтаваць такіх спецыялістаў. Сёння неабходныя інавацыйныя падыходы, новыя мадэлі падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі спецыялістаў. У ВНУ Беларусі ўжо ёсць магчымасць падрыхтоўкі спецыялістаў такога кшталту, а цяпер займаюцца ўкараненнем спецыяльнасці «Эканоміка кіравання нерухомасцю», падзяліўся **Мікалай СІНЯК, рэктар Інстытута ўпраўлення і прадпрымальніцтва, спецыяльны прадстаўнік генеральнага сакратара Еўразійскай арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва (ЕАЭС) па пытаннях нерухомасці ў краінах Еўрапейскага саюза.**

Ён прапанаваў сумесна з нямецкімі экспертамі займацца навучаннем спецыялістаў, у тым ліку па энергаэфектыўнай санацыі будынкаў. І на базе ВНУ і дзяржжанага каледжа стварыць цэнтр кампетэнцый.

— Цэнтр, як мяркуецца, будзе займацца трыма асноўнымі кірункамі пытанняў. Хто будзе плаціць за мерапрыемствы. Як распрацоўваць інавацыйныя праекты і займацца практычным вопытам укаранення тэхналогій з улікам практыкі суседзяў (тут трэба казаць і пра смарт-дамы). А трэці актуальны кірунак развіцця — штучны інтэлект, які дае падказкі, і машыннае навучанне, — акрэсліў перспектывы Мікалай Сіняк.

Promhouse — праект па прафесійным кіраванні жыллём

Праект Еўрапейскага саюза Promhouse па прафтэхадукацыі для кіраўнікоў жылля ў краінах Цэнтральнай Азіі ўжо рэалізоўваецца, прынамсі, у Казахстане і Узбекістане. Ён распачаўся ў студзені 2020 года і скончыцца, па папярэдніх звестках, у чэрвені 2023-га. Праект накіраваны на падтрымку канкурэнтаздольнасці малога і сярэдняга бізнесу праз пашырэнне магчымасцяў і ўмацаванне патэнцыялу малых і сярэдніх прадпрыемстваў у галіне кіравання жыллёвым фондам, расказала **Ларыса ШРЭКЕНБАХ, кіраўнік праекта, ініцыятыва «Жыллёвая гаспадарка ва Усходняй Еўропе» IWO (Берлін).**

Дадзеная мэта ажыццяўляецца з дапамогай асацыяцый КУК (кааператывау уласнікаў кватэр) у Казахстане і некамерцыйных арганізацый, якія займаюцца пытаннямі кіравання жыллём і павышэння энергаэфектыўнасці будынкаў, у прыватнасці, асацыяцыі Арганізацыі прафесійных кіраўнікоў і тых, хто абслугоўвае жыллёвы фонд,

а таксама разам з Еўрапейскім аддзяленнем Міжнароднай асацыяцыі кіраўнікоў жылля. Праект модуль змяшчае тэмы кампетэнцый і мадэрацыі, пакольку кіраўнік — гэта найперш чалавек, які камунікуе і з жыхарамі, і з пастаўшчыкамі паслуг.

— Заплаванавана таксама навучанне і самі выкладчыкі, якое пачалося ў кастрычніку 2020-га. За месяц было праведзена 17 вэбінараў па названых модулях. А ўжо ў 2022-м плануем набраць у каледж вучняў, якія атрымаюць прафесію кіраўніка жылля, — акрэсліла арганізатар праекта.

Патрэбны спецыялісты і аднастайныя рашэнні

Фактычна тым жа кірункам у падрыхтоўцы прафесійных кіраўнікоў нерухомасці збіраецца ісці і Беларусь. Летась уступіла ў сілу новая рэдакцыя закона аб абароне правоў спажыўцоў, дзе дакладна прапісана, што кіраванне — асноватворная паслуга, на падставе якой забяспечваюцца ўсе астатнія жыллёва-камунальныя паслугі, у тым ліку і арганізацыя энергаэфектыўных мерапрыемстваў, заўважыў **Андрэй РАМАШКА, начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства ЖКГ:**

— Пытанне навучання кіраўнікоў нерухомасці вельмі важнае, бо мы добра разумеем, што асноўны момант эфектыўнага кіравання — падрыхтоўка спецыялістаў, якія камунікуюць з жыхарамі для прыняцця рашэнняў. Як паказвае больш чым гадавая практыка рэалізацыі Указа № 327, асноўны момант — падрыхтоўка тых кіраўнікоў, якія будуць і павінны размаўляць з уласнікамі і даводзіць да іх усе аспекты ўцялення.

Кіраваннем агульнай маёмасцю сумесна домаўладання ўсё ж павінны займацца прафесійныя арганізацыі, лічыць прадстаўнік Мінжылкамгаса. Як паказвае практыка, наяўнае на сёння мноства таварыстваў уласнікаў (ТС) і іх кіраўнікоў не дазваляе аднастайна падыходзіць да прыняцця пэўных рашэнняў па абслугоўванні жылля. Хоць у краіне існуе нарматыўная база з патрабаваннямі да яго эксплуатацыі, а таксама адносна аказання жыллёва-камунальных паслуг, сфарміравана і тарыфная палітыка.

Цеплавая мадэрнізацыя, якая будзе выконвацца ў краіне ў межах капітальнага рамонту на гэты год, запланавана ў 24 дамах. Больш хуткаму росту колькасці ахвотных уцяпляцца перашкаджае і тое, што капрамонт у асноўным робіцца за грошы з бюджэту, і тое, што жыхарам цяжка растлумачыць станоўчыя эфекты мадэрнізацыі, лічыць спецыяліст.

Першы і галоўны паказчык якасці жылля — бяспека

Чым больш ведаеш, тым больш карысная можаш прымяніць на практыцы, лічыць **Вольга МАКСІМЕНКА, прэзідэнт грамадскага саюза «Экспертная міжгаліновая асацыяцыя Украіны» (ЭМАУ)** і заклікае сфакусіраваць увагу на вектары трансфармацыйных змен у сферы кіравання жыллём.

— Трэба ведаць, у які бок мы крочым, што хочам атрымаць у выніку. Кіраванне жыллём — гэта складальнік агульнай сістэмы жыццезабеспячэння. Планаванне, распрацоўкі і выбудоўванне інфраструктуры менш чым на 15—20 гадоў проста не робіцца. Усё астатняе — гэта кропкавыя моманты. Трэба разумець, у што менавіта трэба трансфармаваць.

Першы і галоўны паказчык якасці — бяспека. Усе законы і дакументы, што пішуцца, маюць на мэце бяспеку для тых, хто стварае прадукты і паслугі, і тых, хто іх спажывае, падкрэсліла яна:

— Патрабаванні да камфорту і якасці пражывання таксама нельга разглядаць адпольскава для ўсіх. Трэба разумець, што такое норма. Да кожнага тыпу трэба прад'яўляць свае патрабаванні: у двухпавярховіку і шматкватэрным будынку яны будуць розныя. Гэта механізм кантролю і рыначнага нагляду. Аднак разам з тым нельга дапускаць абмежавання формаў і магчымасцяў па-іншаму арганізаваць сваё жыллё. Трэба думаць, што яшчэ можна прапанаваць людзям, якім чынам ім арганізоўваць ў сваім жыллі.

Далёка не заўжды ў дзяржаўных структурах прысутнічаюць эксперты, і іх трэба дадаткова навучаць. Вялікае значэнне ў гэтым маюць кароткатэрміновыя курсы для павышэння кваліфікацыі прафесіяналаў, дадала Вольга Максіменка.

У сваю чаргу, Мінжылкамгас таксама фарміруе трэнінгі і семінары па пытаннях кіравання жыллём. Планаванне ўсіх асноўных мерапрыемстваў у частцы эксплуатацыі жылля і ўтрымання яго інжынерных сістэм робіцца ў Беларусі на пяцігоддзе, нагадаў Андрэй Рамашка. Новай праграмай да 2025 года плануецца, напрыклад, вывезці з ужытку ўсе ліфты, якія працуюць больш за 25 гадоў, а таксама забяспечыць усіх беларусаў якаснай пітной вадой. Капітальна адрамантаваць сёлета, згодна з дзяржпраграмай, плануецца 3,54 млн м², жылля, больш за мільён якога — у сталіцы. У планах — стварэнне праграмы падрыхтоўкі прафесійных кіраўнікоў нерухомасці.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Цяпла няма, а ў батарэях — будзе

Такое становішча ў жыллі краіны працягнецца, бо пакуль яшчэ не зафіксавалі пяці дзён з сярэднясутачнай тэмпературай звонку вышэй за 8 градусаў. Менавіта гэты паказчык можа стаць стымулам для пачатку адключання ацяплення. Між іншым у сталічных адміністрацыйных будынках і на прадпрыемствах батарэі пачалі халадзець ужо з мінулай пятніцы (16 красавіка). Летась ацяпленне ў такіх будынках цалкам у краіне адключылі да майскіх свят.

Мінулагодні ацяпляльны сезон у Беларусі доўжыўся больш за восем месяцаў (з верасня да мая) і быў самым працяглым за апошнія гады. Тады батарэі ў жыллі пачалі адключаць толькі ў маі, а ў сталічных бальніцах, дзіцячых садках і школах — увогуле ў апошні тыдзень вясны. Акрамя даволі халоднага надвор'я, такое рашэнне бачылася тады правільным у тым ліку і з прычыны прафілактыкі сезонных захворванняў падчас пандэміі.

Сёлетні сезон, які пачаўся ў кастрычніку, магчыма, таксама зацягнецца да мая, пакольскі, нягледзячы на нядаўняю дзённую амаль гарачыню, у краіне месцамі на выхадных яшчэ абяцаюць нават начныя прымаразкі. Тым не менш кіраўніцтва Брэсцкай вобласці, як паведамляе БелТА, ужо падрыхтавала ліст, згодна з якім кожны раён будзе прымаць рашэнне аб адключэнні ацяплення згодна з уласнымі мерканваннямі.

— Кіраўнікі іншых абласканкамаў краіны пачынаць завяршэнне ацяплення пакуль не плануюць, прынамсі нам (Мінжылкамгасу) такіх лістоў яшчэ не накіроўвалі, — заўважыў **Генадзь АКСЦІЛОВІЧ, начальнік аддзела па рабоце са звароткамі грамадзян і СМІ Міністэрства ЖКГ.** — Даты ўключэння і адключэння ацяплення залежаць толькі ад умоў надвор'я. Спрагназаваць пачатак і канец сезона іншым чынам немагчыма.

Нагадаем, што падобныя майскія халады здараліся і летась, і некаторыя адключаныя ад цяпла будынкі (дзіцячыя дашкольныя, лячэбна-прафілактычныя, медыцынскія ўстановы) прыйшлося вярнаць у рэжым прапальвання.

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК

ОАО «БНБ-Банк»

220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а.

Бухгалтерский баланс
на 1 января 2021 г.
(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Сим-вол	2020 год	2019 год
1	2	3	4	5
1	АКТИВЫ			
2	Денежные средства	1101	24 806	11 624
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	71 907	126 235
5	Средства в банках	1104	42 416	27 823
6	Ценные бумаги	1105	89 349	71 880
7	Кредиты клиентам	1106	519 951	405 862
8	Производные финансовые активы	1107	95	2 007
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	306	306
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	19 885	20 060
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	2 294	9 763
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	1 895	1 702
13	Отложенные налоговые активы	1112	3	511
14	Прочие активы	1113	4 799	4 122
15	**ИТОГО активы**	**11**	**777 706**	**681 895**
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	91 372	47 212
19	Средства клиентов	1203	555 875	500 269
20	Ценные бумаги банка	1204	24 616	49 018
21	Производные финансовые обязательства	1205	12 685	51
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	3 264	3 040
24	**ВСЕГО обязательства**	**120**	**687 812**	**599 590**
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
26	Уставный фонд	1211	27 688	27 688
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	10 419	7 153
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	13 493	13 529
30	Накопленная прибыль	1215	38 294	33 935
31	**ВСЕГО собственный капитал**	**121**	**89 894**	**82 305**
32	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**	**777 706**	**681 895**

Отчет о прибылях и убытках
за 2020 год
(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2020 год	2019 год
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	52 260	41 935
2	Процентные расходы	2012	31 640	23 857
3	Чистые процентные доходы	201	20 620	18 078
4	Комиссионные доходы	2021	18 565	15 662
5	Комиссионные расходы	2022	4 193	3 731
6	Чистые комиссионные доходы	202	14 372	11 931
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	(745)	(553)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	33 035	9 604
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	(18 855)	4 809
11	Чистые отчисления в резервы	207	11 092	5 711
12	Прочие доходы	208	12 843	8 268
13	Операционные расходы	209	39 206	32 040
14	Прочие расходы	210	2 613	2 289
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	8 359	12 097
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	1 164	1 923
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	7 195	10 174
18	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях			
19	Базовая прибыль на простую акцию	22	0,0026	0,0037
20	Разводненная прибыль на простую акцию	23	-	-

ОТЧЕТ об изменении собственного капитала
за 2020 год
(в тысячах белорусских рублей)

Наименование показателей	Символ	Наименование статей собственного капитала					
		устав-ный фонд	эмиссион-ный доход	резерв-ный фонд	нако-пленная при-быль (убы-ток)	фонды перео-ценки статей балан-са	всего соб-ствен-ный ка-питал
2	3	4	5	6	7	8	9
Раздел I. За год, предшествующий отчетному							
Остаток на 1 января 2019 г.	3011	27 688	-	6 400	25 356	12 392	71 836
В том числе: результат от изменения учетной политики и (или) исправления существенных ошибок	30111	-	-	-	-	-	-
Изменения статей собственного капитала	3012	-	-	753	8 579	1 137	10 469
В том числе: совокупный доход	30121	x	x	x	10 174	1 403	11 577
направление прибыли на пополнение фондов	30122	-	x	400	(400)	x	-
операции с учредителями (участниками):	30123	-	-	-	(1 108)	x	(1 108)
внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	-	-	x	x	x	-
выплата дивидендов акционерам	301232	x	x	x	(1 108)	x	(1 108)
операции с собственными выкупленными акциями	301233	-	-	x	x	x	-
внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков	301234	x	x	-	-	x	-
перераспределение между статьями собственного капитала	30125	-	-	353	(87)	(266)	-
прочие изменения	30126	-	-	-	-	-	-
Остаток на 1 января 2020 г.	3013	27 688	-	7 153	33 935	13 529	82 305
Раздел II. За отчетный год							
Остаток на 1 января 2020 г.	3011	27 688	-	7 153	33 935	13 529	82 305
Изменения статей собственного капитала	3012	-	-	3 266	4 359	(36)	7 589
В том числе: совокупный доход	30121	x	x	x	7 195	394	7 589
направление прибыли на пополнение фондов	30122	-	x	3 000	(3 000)	x	-
операции с учредителями (участниками):	30123	-	-	-	-	x	-
внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	-	-	x	x	x	-
выплата дивидендов акционерам	301232	x	x	x	-	x	-
операции с собственными выкупленными акциями	301233	-	x	x	x	x	-
внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков	301234	x	x	-	-	x	-
перераспределение между статьями собственного капитала	30125	-	-	266	164	(430)	-
прочие изменения	30126	-	-	-	-	-	-
Остаток на 1 января 2021 г.	3013	27 688	-	10 419	38 294	13 493	89 894

СВЕДЕНИЯ о совокупном доходе
за 2020 год
(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2020 год	2019 год
1	2	3	4	5	6
1	Прибыль (убыток)	301211	22	7 195	10 174
2	Прочие компоненты совокупного дохода	301212	21	394	1 403
	В том числе:				
2.1	переоценка основных средств и прочего имущества	3012121		328	1 403
2.2	переоценка нематериальных активов	3012122		-	-
2.3	переоценка ценных бумаг	3012123		66	-
2.4	переоценка инструментов хеджирования	3012124		-	-
2.5	переоценка прочих статей баланса	3012125		-	-
3	**ИТОГО совокупный доход**	**30121**		**7 589**	**11 577**

Отчет о движении денежных средств
за 2020 год
(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2020 г.	2019 г.
1	2	3	4	5
1	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**			
2	Полученные процентные доходы	70100	51 910	41 180
3	Уплаченные процентные расходы	70101	(32 278)	(23 647)
4	Полученные комиссионные доходы	70102	18 902	14 987
5	Уплаченные комиссионные расходы	70103	(4 309)	(3 749)
6	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	70104	-	-
7	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	70105	(745)	(553)
8	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	70106	32 435	9 769
9	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	70107	-	-
10	Прочие полученные доходы	70108	5 328	5 729
11	Прочие уплаченные расходы	70109	(28 208)	(29 591)
12	Уплаченный налог на прибыль	70110	(1 995)	(1 751)
13	Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого	701	41 040	12 374
14	Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке	70200	49 611	(51 550)
15	Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках	70201	(2 853)	9 644
16	Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения)	70202	549	(18 848)
17	Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам	70203	(40 499)	(71 227)
18	Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов	70204	2 890	2 531
19	Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах	70205	883	13 537
20	Поток денежных средств от изменения операционных активов – итого	702	10 581	(115 913)
21	Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка	70300	-	-
22	Чистый прирост (снижение) денежных средств банков	70301	34 774	(16 477)
23	Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов	70302	(18 133)	127 193
24	Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг банка	70303	(24 100)	18 140
25	Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств	70304	(7 199)	51
26	Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах	70305	(29 623)	(10)
27	Поток денежных средств от изменения операционных обязательств – итого	703	(44 281)	128 897
28	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности	70	7 340	25 358
29	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**			
30	Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	71100	(1 748)	(9 078)
31	Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	71101	8 019	6 662
32	Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	71102	-	(170)
33	Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	71103	-	-
34	Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения	71104	-	(1 180 612)
35	Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения	71105	-	1 180 406
36	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности	71	6 271	(2 792)
37	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**			
38	Эмиссия акций	72100	-	-
39	Выкуп акций собственной эмиссии	72101	-	-
40	Продажа ранее выкупленных акций собственной эмиссии	72102	-	-
41	Выплата дивидендов	72103	-	(1 108)
42	Внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков	72104	-	-
43	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности	72	-	(1 108)
44	Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты	73	4 122	(460)
45	Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов	74	17 733	20 998
46	Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода	740	x	98 413
47	Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода	741	116 146	x

Генеральный директор Л. Акубардия

Главный бухгалтер Г.Л. Лаптёнок

Дата подписания: 23 марта 2021 г.

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта БНБ-Банка:
https://www.bnb.by/o-nas/nashi-rezultaty/bukhgalterskaya-otchetnost/
Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк»

Лицензия на осуществление банковской деятельности,
выданная Национальным банком Республики Беларусь № 10 от 7 июня 2013 г. УНП 100513485.

Ernst & Young LLC
Kiary Tsentr, 5 A, 15th floor
Minsk, 220004, Republic of Belarus
Tel: +375 (17) 240 42 42
Fax: +375 (17) 240 42 41
www.ey.com/by

ООО «Эрнст энд Янг»
Республика Беларусь, 220004, Минск
ул. К. Цеткин, 51 А, 15-й этаж
Тел.: +375 (17) 240 42 42
Факс: +375 (17) 240 42 41

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ

независимой Аудиторской организации ООО «Эрнст энд Янг» по годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности Открытого акционерного общества «БНБ-Банк», подготовленной по итогам деятельности за период с 1 января 2020 года по 31 декабря 2020 года

Господину Лаше Акубардия
Генеральному директору Открытого акционерного общества «БНБ-Банк»

Акционерам, Совету директоров, Аудиторскому комитету
и Правлению Открытого акционерного общества «БНБ-Банк»

Национальному банку Республики Беларусь

Аудиторское мнение

Мы провели аудит прилагаемой годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности (далее – «годовая финансовая отчетность») Открытого акционерного общества «БНБ-Банк» (далее ОАО «БНБ-Банк», «Банк»), состоящей из бухгалтерского баланса по состоянию на 1 января 2021 года (Форма 1), отчета о прибылях и убытках (Форма 2), отчета об изменении собственного капитала (Форма 3), отчета о движении денежных средств (Форма 4) за 2020 год и примечаний к годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Указанная годовая финансовая отчетность была подготовлена руководством Банка в соответствии с Законом Республики Беларусь «О бухгалтерском учете и отчетности», постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 12 декабря 2013 года № 728 «Об утверждении Инструкции об организации ведения бухгалтерского учета и составления бухгалтерской (финансовой) отчетности», постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года № 507 «Об утверждении Инструкции по составлению годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности» и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки годовой финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде (далее – «законодательство Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности»).

По нашему мнению, прилагаемая годовая финансовая отчетность достоверно, во всех существенных аспектах, отражает финансовое положение ОАО «БНБ-Банк» по состоянию на 1 января 2021 года, финансовые результаты его деятельности и изменения его финансового положения, в том числе движение денежных средств, за 2020 год в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности.

Основание для выражения аудиторского мнения

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности. Наши обязанности в соответствии с этими требованиями описаны далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой финансовой отчетности» настоящего заключения. Нами соблюдались принцип независимости по отношению к аудируемому лицу согласно требованиям законодательства и принципы профессиональной этики. Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

Ключевые вопросы аудита

Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для проводимого аудита годовой финансовой отчетности за текущий период. Эти вопросы были рассмотрены в контексте аудита годовой финансовой отчетности в целом и при формировании нашего аудиторского мнения об этой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения об этих вопросах. В отношении указанного ниже вопроса наше описание того, как данный вопрос был рассмотрен в ходе нашего аудита, приводится в этом контексте.

Мы выполнили обязанности, описанные в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой финансовой отчетности» нашего заключения, в том числе по отношению к этому вопросу. Соответственно, наш аудит включал выполнение процедур, разработанных в ответ на нашу оценку рисков существенного искажения годовой финансовой отчетности. Результаты наших аудиторских процедур, в том числе процедур, выполненных в ходе рассмотрения указанного ниже вопроса, служат основанием для выражения нашего аудиторского мнения о прилагаемой годовой финансовой отчетности.

Ключевой вопрос аудита

Специальные резервы на покрытие возможных убытков по кредитам клиентам

Оценка уровня специальных резервов на покрытие возможных убытков по кредитам клиентам (далее — «специальные резервы») в соответствии с требованиями постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 28 сентября 2006 года № 138 «Об утверждении Инструкции о порядке формирования и использования специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе» является ключевой областью суждения руководства Банка. При оценке кредитных рисков на значительной степени используются профессиональное суждение и допущения, а также производится анализ различных факторов, включая финансовое состояние заемщика, стоимость реализации объектов залога и прочие.

В связи с существенности сумм кредитов клиентам, а также высокого уровня субъективности суждений оценка специальных резервов представляет собой ключевой вопрос аудита.

Информация о специальных резервах на покрытие возможных убытков по кредитам клиентам и подход руководства Банка к оценке и управлению кредитным риском описаны в Примечаниях 8, 28 и 38 к годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка.

Как данный ключевой вопрос был рассмотрен в ходе нашего аудита

Наши аудиторские процедуры были выполнены в отношении процесса создания специальных резервов по кредитам юридическим и физическим лицам, включая изучение кредитных договоров, договоров обеспечения, анализ методологии создания специальных резервов, оценки финансового состояния клиентов и выявления признаков негативной информации.

Наши аудиторские процедуры включали в себя пересчет резервов по индивидуально существенным кредитам, а также кредитам, имеющим повышенный кредитный риск. А именно, помимо прочего, мы провели анализ финансового состояния клиентов, признаков негативной информации, наличия просроченной и реструктуризированной задолженности, ожидаемых будущих денежных потоков, обеспеченности задолженности по кредитам, в том числе стоимости реализуемого залога. Мы проанализировали последовательность суждений руководства, применяемых при классификации задолженности по кредитам по группам риска.

Мы проанализировали информацию по специальным резервам на покрытие возможных убытков по кредитам клиентам, раскрытой в примечаниях к годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка.

Обязанности аудируемого лица по подготовке годовой финансовой отчетности

Руководство аудируемого лица несет ответственность за подготовку и достоверное представление годовой финансовой отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля аудируемого лица, необходимой для подготовки годовой финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке годовой финансовой отчетности руководство аудируемого лица несет ответственность за оценку способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в годовой финансовой отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать аудируемое лицо, прекратить его деятельность или когда у руководства отсутствует иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки годовой финансовой отчетности аудируемого лица.

Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой финансовой отчетности

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что годовая финансовая отчетность аудируемого лица не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, позволит выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей годовой финансовой отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, аудиторская организация применяет профессиональное суждение и сохраняет профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

- выявляем и оцениваем риски существенного искажения отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие;
- получаем понимание системы внутреннего контроля аудируемого лица, имеющей значение для аудита, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;
- оцениваем надлежащий характер применяемой аудируемым лицом учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в годовой финансовой отчетности;
- оцениваем правильность применения руководством аудируемого лица допущения о непрерывности деятельности и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;
- оцениваем общее представление годовой финансовой отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также того, обеспечивает ли годовая финансовая отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.


Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.
Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **12 мая 2021 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с **22.04.2021 по 06.05.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «АМКОДОР-УНИМОД»
220073, г. Минск, ул. Пинская, 18, тел. 256-27-01

ИНФОРМАЦИЯ об акционерном обществе и его деятельности (Форма 1)

4. Доля государства в уставном фонде эмитента – 0 % (всего, в процентах).

5. Количество акционеров – всего 395, в том числе: юридических лиц – 4, из них нерезидентов Республики Беларусь – 0, физических лиц – 391, из них нерезидентов Республики Беларусь – 0.

6. Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателей	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	тысяч рублей	-	-
Обеспеченность акции имуществом общества	рублей	3,25	1,37
Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего	штук		

7. Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тысяч рублей	22534,00	12624,00
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию	тысяч рублей	22532,00	14419,00
Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (прибыль (убыток) отчетного периода)	тысяч рублей	127,00	-1380,00
В том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тысяч рублей	2,00	-1795,00
прочие доходы и расходы по текущей деятельности	тысяч рублей	124,00	217,00
прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности	тысяч рублей	1,00	198,00
Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	тысяч рублей	56,00	0,00
Чистая прибыль (убыток)	тысяч рублей	71,00	-1380,00
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	тысяч рублей	-1524,00	-1582,00
Долгосрочная дебиторская задолженность	тысяч рублей	0,00	0,00
Долгосрочные обязательства	тысяч рублей	0,00	0,00
8. Среднесписочная численность работающих	человек	211	192

9. Основные виды продукции или виды деятельности: 281552 – производство шеферных элементов зубчатых передач и приводов, производство общемашиностроительных узлов и деталей.

10. Дата проведения годового общего собрания акционеров – 25.03.2021 г.

Аудиторское заключение по бухгалт

Традыцыі

Паштоўкі ў стылі «папяровы арт»

Майстар выцінанкі лічыць, што кожны здолее зрабіць падарунак з дапамогай паперы і нажніц

Асабіста мая цікавасць да гэтага мастацтва прачнулася падчас наведвання аднаго з беларуска-кітайскіх форумаў, які праходзіў у Гродне. Майстар з Паднябеснай выразаў на вачах удзельніцкіх мудрагелістыя ўзоры, прычым з такімі тонкімі і дробнымі дэталямі, што нельга было не здзівіцца. Арганізатар імпрэзы, якая бачыла маё захапленне, папрасіла майстра падарыць адзін такі папяровы цуд. Яна патлумачыла і яго сэнс: дзве качкі, якія плывуць па вадзе пад кветкай лотаса, сімвалізуюць згоду і дабрабыт у доме. З тае пары заўсёды звяртаю ўвагу на работы майстроў па выцінанцы. Нядаўна зацікавілі творы гродзенкі Таццяны НІКІЦІК, якія ўвайшлі ў экспазіцыю выстаўкі «Крыніцы народных талентаў».

Дарэчы, пра Кітай. Аказваецца, выцінанка прыйшла менавіта адтуль, і звязана гэта са з'яўленнем паперы. Тамы мнагабокага кітайскія майстры такія здольныя ў гэтай справе. Яны ўдасканалваюць сваё майстэрства на працягу многіх стагоддзяў. Дарэчы, і само слова «выцінанка» азначае «старанна выводзіць узор, займацца нечым карпатлівым».

А вось беларуская выцінанка значна маладзейшая. Як расказала **вядучы метадычнага цэнтра народнай творчасці Яніна БАРЫСЕВІЧ,** росквіт айчыннага майстэрства прыйшоўся на канец XIX — пачатак XX стагоддзяў. Існуе меркаванне, што сёлета беларускай выцінанцы ро'ўна сто гадоў. А яшчэ лічыцца, што гэта самы просты і даступны від творчасці. Магчыма, так было раней. Бо папярэднікамі сучасных высокамастацкіх твораў былі простыя папяровыя сурвэткі, фіранкі, гірлянды, якія ўпрыгожвалі жытло. У першую чаргу такія ўзоры былі абрамленнем абразоў на покуці. Па словах Яніны Барысевіч, выцінанка стала масавай з'явай у пасляваенныя гады. А ў 1960—1970-х на змену папяровым вырабам прыйшлі больш даўгавечныя матэрыялы. Старыя выцінанкі ніхто не захоўваў, іх, як правіла, спальвалі. Пазней этнографы і музейныя работнікі літаральна па крупінках сталі збіраць такія вырабы і пасля экспедыцый рабілі выстаўкі.

Але выцінанка не сышла ў нябыт, а вярнулася ў новай якасці. У 70—80-я гады мінулага стагоддзя творчасць адраджаецца як цікавасць да традыцыйнай спадчыны і становіцца раўнапраўным відам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Хоць і нельга сказаць, што масавым. Напрыклад, мне не даводзілася бачыць такія работы на гадарскіх кірмашах. Як правіла, іх часцей можна сустрэць на выстаўках. На адной з іх і адбылося знаёмства з маладым майстрам Таццянай Нікіцік. Яна па адукацыі мастак-дызайнер, працуе ў сферы культуры, не так даўно захапілася выцінанкай. Можна сказаць, што адна з першых у Гродзенскім раёне ўзялася запоўніць свабодную нішу.

На выставе майстроў народнай творчасці прадстаўлена нямала яе работ. Напрыклад, серыя з двух дзясяткаў мініяцюр пад назвай «Дакрануцца да гісторыі» прысвечана славутасцям Гродзенскага раёна. Гэта аб'екты, якія занесены ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Яны ёсць у многіх населеных пунктах: гэта храмы, палацы, сядзібы. Таццяна рабіла эскізы па фотаздымках, а потым выразвала. Яшчэ адна серыя работ прысвечана старажытным народным сімвалам.

— Выцінанка, на мой погляд, — такое мастацтва, дзе важна захаваць традыцыі. Гэта сімвалы, якія прыйшлі з даўніх часоў. Напрыклад, «дрэва жыцця» — сімвал роду. Карані — нашы продкі, ствол — бацькі, а галінкі — дзеці. Вядома, могуць быць розныя інтэрпрэтацыі гэтага сімвала, але агульны пасыл менавіта такі, — тлумачыць субяседніца.

На яе думку, такая сакральнасць, далучэнне да народных традыцый дае адчуванне радасці і нейкай магічнай моцы. І гэты аспект варта захаваць у сённяшняй хвалі цікавасці да гэтай творчасці, лічыць Таццяна Нікіцік. Таму ў выцінанках імкнецца адлюстраваць менавіта народныя сімвалы. Сімволіка выцінанкі вельмі блізкая да сімволікі арнаментаў.

Тут абавязкова прысутнічаюць птушкі. Калі яны павернуты дзюбкамі адна да адной, гэта азначае шчасце і дабрабыт. Зоркі, анёлы, буслы, валошкі, велікодныя яйкі, расліны арнамент — усё гэта характэрна для выцінанкі Гродзеншчыны.

— Каб выразваць, трэба намаляваць, але многія вопытныя майстры могуць рабіць без схемы, — дзеліцца сакрэтамі творчасці Таццяна. — Штосьці я таксама магу сама выразваць без схемы, напрыклад, дрэва жыцця. Тут выкарыстоўваецца адзін ліст паперы, цэльны. Складваюць паперу розным спосабамі для сіметрыі. Па згібах выразваюцца ўзоры. Можна выразваць цэнтрычны — гэта як снежынка, толькі больш складана, квадратнай ці іншай формы. Ёсць яшчэ такое складанне, як рапортнае. Гэта калі з палоскі складваецца гармонік і выразваецца.

У работах Таццяны пераважаюць тыя колеры, якія выкарыстоўвалі раней. Звычайна гэта манахромная гама: чорны, белы, чырвоны, бардовы, цёмна-сіні. Яркія фарбы, па словах майстра, для беларускай выцінанкі не характэрны. У асноўным тоны больш прыглушаныя. У работе карыстаецца маленькімі нажніцамі, якія могуць праразваць усе малыя дэталі. Ад гэтага залежыць дэкаратыўнасць вырабу. Гатовую работу Таццяна наклейвае на паперу, потым прасуе. Цікаўлюся, ці можна авалодаць такім майстэрствам.

— Гэта не так складана, як падаецца на першы погляд, — лічыць рукадзельніца. — Пры жаданні такую тэхніку можна засвоіць. Магчыма, не ва ўсіх атрымаецца нейкі мудрагелісты і складаны ўзор. Між тым зрабіць вішнавальную паштоўку з элементам выцінанкі па сілах многім.

Галоўнае — быць максімальна акуратным, настойлівым і цярплівым. Тады вынікам можа стаць твор, які парадуе не толькі выканаўцу, але і таго, каму паштоўка адрасавана. Дарэчы, нямала майстар-класаў па выцінанцы можна знайсці ў інтэрнэце. Напрыклад, паспрабаваць выразаць у спрошчаным варыянце тое ж дрэва жыцця і такім чынам далучыцца да сапраўднай народнай творчасці з мінімальным наборам матэрыялу. Па словах Таццяны, папяровы арт прыносе задавальненне кожнаму, а можа, і дасць новы імпульс для далейшай творчасці. А яшчэ даказана, што выразванне з паперы з'яўляецца добрым аўтатрэнінгам для нервовай сістэмы, дае душэўную раўнавагу і здымае стрэс. І ўвогуле, гэта прыгожа. Нездарма выцінанка набірае шмат прыхільнікаў. Апошнім часам дэкаратыўна-прыкладное мастацтва папулярнае і ў гарадской культуры: упрыгожванне вітрын, вокнаў, інтэр'ераў. Выцінанка з прымітыўнага рамяства выйшла на прафесійны ўзровень.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.

Выстава

«Каб не страціць свае карані»

Калі вам падабаецца гістарычная тэматыка і цікава ўбачыць унікальную сямейную перапіску XIX стагоддзя, а яшчэ кнігі са знакамітай бібліятэкі Храптовіча у Шчорсах, завітайце на выстаўку «Кнігазбор Храптовіча: на шляху вяртання», якая праходзіць у Нацыянальнай бібліятэцы. Упершыню тут паказаны лісты прадстаўнікоў гэтага роду і тры кнігі, якія вярнуліся ў Беларусь з Германіі ў лютым 2020 года. Вяртанне адбылося дзякуючы намаганням дабрачыннага фонду «Шчорсы і Храптовічы».

Трэба адзначыць, што кнігазбор Храптовічаў, які пачаў складаць канцлер Іаахім Літавор-Храптовіч у XVIII стагоддзі, лічыўся адной з найбагацейшых бібліятэк на Усходняй Еўропе. Падчас адкрыцця выстаўкі адбылася афіцыйная перадача кніг і перапіскі Храптовічаў на захоўванне ў Нацыянальную бібліятэку.

— Упэўнены, сённяшняя падзея дасць новы імпульс вяртанню спадчыны Храптовічаў на Радзіму. Гэтая экспазіцыя яшчэ раз паказвае, наколькі багатая беларуская кніжная культура, якія разнастайныя нашыя культурныя зносіны з многімі краінамі свету і як шмат нам яшчэ трэба будзе зрабіць, каб вярнуць страчаныя веды пра мінулае, — падкрэсліў **намеснік генеральнага дырэктара — дырэктар па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Аляксандр СУША.**

На выстаўцы можна даведацца пра першы вопыт вывучэння кніг і ліставання Храптовічаў, пра іх значэнне для беларускай і сусветнай культуры, пра новыя крокі ў вывучэнні гісторыі знакамітага роду, яго спадчыны ў Беларусі і замежжы, пра шляхі яе вяртання на Радзіму. А яшчэ ўбачыць, як у далёкія часы выглядалі лісты, як акуратна выведзена на іх кожная літара, з якой любоўю, з якім клопатам іх пісалі. Вельмі прыемна, што лісты захаваліся ў выдатным стане.

— У 1916 годзе ў Шчорсах праходзіла лінія фронту Першай сусветнай вайны. Пышны маёнтак Храптовічаў, адной з самых багатых сем'яў Беларусі, трапіў у эпіцэнтр ваенных дзеянняў. У падвале палаца размясціўся расійскі штаб, сам будынак неаднаразова падвяргаўся абстрэлам. Аднак нямецкія салдаты занялі ўвесь палац, моцна пацярпелі ад вайны. Сярод іх быў Юліус Херман, адкаваны чалавек, які ведаў цану кнігам. Ён убачыў раскіданыя выданні і лісты, старанна ўсё сабраў і адправіў дахаты па пошце. Вярнуўшыся дадому, ён доўгія гады вывучаў змест дакументаў, рабіў нататкі, а пасля смерці завяшчаў свайму сям'і вярнуць кнігі на іх Радзіму, — распавяла **дырэктар фонду «Шчорсы і Храптовічы» Ганна БУЛДА.**

Таксама на выстаўцы прадстаўлены мастацкія работы студэнтаў БНТУ, якія працавалі валанцёрамі на летніках па добраўпарадкаванні маёнтка Храптовічаў у Шчорсах у 2018—2019 гадах. Нягледзячы на тое, што на ўсіх карцінах намаляваны маёнтак Храптовічаў, кожная нясе ўласны настрой. Адны карціны выкананы ў яркіх колерах, маюць прыемную, лёгкую энергетыку. Іншыя — бляклыя, нібы старыя фатаграфіі, якія перажылі многае. Глядзіш на іх — і сэрца сціскаецца ад настальгічнага пачуцця, якое яны нясуць.

Цікава, што пра род Храптовічаў засталося шмат звестак. Напрыклад, кніга Вольгі Храповіч-Буцянёвай: там змешчана апісанне перадваеннага перыяду, жыцця яе сям'і з 1935 да 1939 гады. Яшчэ ёсць кніга Міхаіла Храптовіча-Буцянёва, якую ён напісаў на англійскай мове пра род Храптовічаў, і кніга Іаахіма Храптовіча «Храналогія роду Храптовічаў».

Пасля гэтай выстаўкі пачынаеш думаць пра важнае: а што застанецца пасля маёй сям'і? Ці будуць захаваныя фатаграфіі, лісты? Кожны з нас павінен клапаціцца аб тым унёску, які ён можа зрабіць дзеля захавання гісторыі краіны. Можа быць, ваша сям'я і не валодае ўласнай бібліятэкай, але ў любым доме ёсць нешта ўнікальнае і каштоўнае. Няхай людзям збоку вашыя сямейныя фатаграфіі, традыцыі не пададуцца вартымі ўвагі, але для вас яны мусяць быць важныя. Захоўвайце і шануйце! Бо жыццёвы шлях любой сям'і — гэта частка вялікай гісторыі.

Экспазіцыю спадчыны Храптовічаў можна наведаць да 30 красавіка.

Ангеліна ВАРАТЫНСКАЯ.
Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Спадчына

ШТО БУДЗЕ З «ШАГАЛАЎСКАЙ» СІНАГОГАЙ?

У Віцебску руіны Вялікай Любавіцкай сінагогі на вуліцы Рэвалюцыйнай (недалёка ад аўтавакзала) усё часцей называюць «шагалаўскай». І нездарма, бо недалёка — на вуліцы Пакроўская — дом вядомага на ўвесь свет мастака. А музей Марка Шагала ў Віцебску — адзін з галоўных інтэрв'юіраваў таго, каб усё, што засталося ад малітоўнага дома, сапраўды стала часткай гістарычнай спадчыны.

Днямі праблему захавання і аднаўлення, перспектывы выкарыстання сінагогі абмяркоўвалі ў згаданай установе культуры падчас міжнароднага круглага стала. У ім узялі ўдзел эксперты з Беларусі, Расіі, Літвы, Польшчы, Ізраіля.

Дакладна невядома, калі пабудавалі сінагогу, адну з больш чым сямідзесяці тых, якія былі ў Віцебску: у пачатку мінулага або ў канцы пазамінулага стагоддзяў — але ў любым выпадку ў дарэвалюцыйны час.

У сярэдзіне 1920-х тут жыл літоўскія яўрэі-бежанцы, якія перабраліся ў Віцебск. Сінагогу канчаткова зачынілі ў 1929-м. Потым яе выкарыстоўвалі ў якасці клуба Саюза дрэваапрацоўшчыкаў.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны тут зрабілі саляны склад.

Сёння з гістарычных рэлігійных будынкаў былая Любавіцкая сінагога засталася адна. На жаль, нават проста зайсці оцэнку, небяспечна. Таму турысты разглядаюць яе толькі звонку.

Дырэктар музея Марка Шагала Ірына ВОРАНАВА працытавала радкі са знакамітай аўтабіяграфічнай кнігі мастака «Маё жыццё». Ён напісаў пра бацьку, які вельмі рана ўставаў, потым ішоў у сінагогу, вяртаўся дадому, каб выпіць гарбаты і пайсці на работу. Безумоўна, на логіцы ён хадзіў куды блізкэй: як сёння б сказалі, у «крокавай даступнасці». І звычайна туды ж накіроўваліся і іншыя члены сям'і.

У пазамінулым годзе ініцыятыўная група пачала работу над прыцягненнем увагі грамадскасці да руін Вялікай Любавіцкай сінагогі ў Віцебску. У дзень нараджэння Майстра быў праведзены нядзельнік па прыборцы тэрыторый, устаноўлена інфармацыйная дошка «Побач з намі — незвычайны помнік даўніны».

А ў верасні таго ж года ў музеі прайшла міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Спадчына былых сінагог: у пошуках новых функцый і значэнняў», на якой абмяркоўвалася ў тым ліку і актуалізацыя руін. Мэта энтузіястаў — арганізацыя дыялогу і стварэнне агульнай канцэпцыі захавання і развіцця былой сінагогі, адзначыла кіраўнік музея. Пры гэтым важна прыцягнуць як мага большую колькасць удзельнікаў (дзяржаўныя структуры, рэлігійныя суполкі, грамадскія арганізацыі, фонды) і зрабіць працэс аднаўлення (распрацоўкі канцэпцыі) максімальна празрыстым і інклюзіўным.

Дарэчы, каля дзесяці гадоў таму Віцебскім заводам электраапрыбораў была распрацавана перадпраектная дакументацыя па рэканструкцыі сінагогі для адкрыцця там культурнага цэнтра. Але справа не пайшла... Пра гэта распавёў **намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама Віктар ГЛУШЫН.** Ён падкрэсліў, што мясцовая ўлада вельмі зацікаўлена ў тым, каб сінагога была ўключана ў актыўнае гарадское асяроддзе. І ёсць разуменне неабходнасці гэтага ў аблвыканкамае і Міністэрстве культуры. Зямельная служба працуе над выпускненем участка, каб сінагогу можна было рэканструяваць, растлумачыў Віктар Глушын.

У поспеху справы выказаў зацікаўленасць Іцхак Коган, раві'н сінагогі на Вялікай Бронная у Маскве, кіраўнік аб'яднання хасідаў СНД «Хабад». Дарэчы, сям'я Шагала была хасідская. Іцхак Коган сказаў, што Віцебск для яго не чужы горад, бо тут жылі яго сваякі. Ён запрасіў маладога віцебскага архітэктара Глеба Арлоўскага, які расказаў яму пра жудасны стан будынка, больш падрабязна абмеркаваць праблему — асабіста на відэасувязі, паабяцаў дапамагчы.

Летась камітэт «Віцебскабламаёмасці» выставіў руіны Вялікай Любавіцкай сінагогі на продаж. І некалькі патэнцыйных інвестараў выказала зацікаўленасць аб'ектам — у прыватнасці, літоўскі прадпрымальнік Раналдас Вайчайціс, які займаецца дрэваапрацоўчым бізнесам на Віцебшчыне. Ён, дарэчы, жыве недалёка ад былой сінагогі. На круглым стале бізнесмен агучыў наступную ідэю: чаму б не зрабіць турыстычна-рэлігійны бізнес-комплекс?

У размове з карэспандэнтам «Звязды» прадпрымальнік сказаў, што калі даведаўся пра магчымасць купіць будынак за базавую велічыню, задумаўся аб куплі. Паколькі з дзяцінства захапляецца гісторыяй, палюбіў гэтых краінах былыя сінагогі выкарыстоўваюцца ў якасці ўстаноў культуры.

Каля руін сінагогі (фота 2019 года).

У канцы мая запланавана правесці тыдзень па навядзенні парадку на тэрыторыі былой сінагогі і побач. Потым магчыма будзе арганізаваць грунтоўнае інжынернае даследаванне будынка. Ужо даўно спецыялісты канстатуюць, што калі не рэстаўраваць сінагогу ў найбліжэйшай перспектыве, трэба абавязкова і як мага хутчэй закансерваваць аб'ект, абараніць яго ад вандалаў.

«Звязда» будзе сачыць за тым, што робіцца, каб у Віцебску аднавілі «шагалаўскую» сінагогу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ,
фота аўтара.

З вякоў мінулых

«Скарбніца Падняпроўя» папоўнілася новай аўтэнтыкай

У Магілёве распачаўся фестываль, дзе ўдзельнікі дэманструюць адноўленыя і бытуючыя аўтэнтычныя песні, танцы, гумар і кухню жыхароў рэгіёна.

У праграме фестывалю, які будзе доўжыцца да верасня і пройдзе ў тры этапы, — тэматычныя канцэрты, семінары-практыкумы, прысвечаныя традыцыйнай народнай творчасці беларусаў, спаборніцтва па прыняцыпе «хто каго ператанцуе, хто каго перапяе», майстар-класы, фальклорныя танцавальныя, гумарыстычныя вечарыны і іншае. Старт фестывалю даў канцэрт «Галасы Падняпроўя», у якім бралі ўдзел дзіцячыя і дарослыя народныя калектывы, салісты ўстаноў культуры вобласці, носьбіты песеннага фальклору Чэрыкаўскага, Краснапольскага, Клімавіцкага, Магілёўскага, Асіповіцкага раёнаў і Магілёва.

Валянціна МАРЧАНКА, метадыст па традыцыйнай культуры Краснапольскага раённага цэнтра культуры, на працягу 30 гадоў працуе кіраўніком народнага фальклорнага ансамбля «Горскія харашухі» пры Горскім сельскім Доме культуры. Вёска Горы знаходзіцца літаральна на граніцы з Расіяй, цікавага матэрыялу шмат. Увесь рэпертуар калектыву — гэта тое, што атрымалася сабраць, перанясь з вуснаў у вусны ад старажылаў вёсак Горы і суседніх.

— Шмат песень, якія зараз спяваюць «Горскія харашухі», ад маёй маці, — кажа Валянціна Аляксандраўна. — На жаль, вёскі старэюць, і носьбіты сыходзяць. Летась мы сабралі выдатную салістку нашага ансамбля Веру Пятроўну, якая прынесла ў нашу скарбонку ўнікальныя творы. Гэта аўтэнтычныя песні, якія выконваюцца акапэльна і адрозніваюцца вялікай прыгажосцю, чысцінёй, узнёсласцю. Заўсёды горка, калі такія носьбіты сыходзяць. І ад гэтага выразней разумееш, як важна захаваць, перадаць нашчадкам бясцэнны дар.

Валянціна Марчанка за апошнія шэсць гадоў работы метадыстам паспела адкрыць некалькі ўнікальных свечкавых абрадаў — у Краснаполлі, вёсках Казелле, Халмы, Буглаях. У Буглаях знайшла яшчэ і носьбітаў аброчнага абеду. Акрамя гэтага, сабрала шмат цікавых паданняў, легенд і песень. Старацца часцей выдаваць брашуры і буклеты, арганізоўвае навучальныя семінары з работнікамі сельскіх дамоў культуры, каб далучыць іх да пошукавай дзейнасці.

— Гэты фестываль вельмі нам патрэбны, — пераканана даследчыца фальклору. — У нас ёсць рэдкая магчымасць паглядзець розныя раёны Магілёўскай вобласці, падзяліцца вопытам, пачуць адзін аднаго, параўнаць.

Народную творчасць сваёй малой радзімы прадэманстравалі праслаўленыя фальклорныя калектывы з Клімавіцкага раёна: дарослы «Астранка» і дзіцячы «Астраначка». Назвы, дарэчы, дала невялічкая мясцовая рачулка.

— З дапамогай дзетак мы стараемся захаваць спадчыну нашых бабуль, працягнуць справу нашага былога кіраўніка і заснавальніцы Галіны Бруквай, — кажа **кіраўнік народнага фальклорнага калектыву «Астранка» Ірына ШАЛАШЭНЬ,** якая спявае фальклор з другога класа. — «Астраначка» — пераемніца «Астранкі». Самаму малодшаму нашаму выканаўцу — шэсць гадоў. На жаль, школы ў нашай вёсцы Стары Дзядзін ужо няма, дзеці ходзяць на заняткі ў суседнюю вёску. Калі яны ў нас вучыліся, больш цікавіліся народнымі традыцыямі. Вёска, на жаль, вымірае, засталося 100 чалавек. Але ўсе ўдзельніцы калектыву жывуць выключна ў Старым Дзядзіне. Гаспадарка выручае. У жыцці таксама прытрымліваемся традыцый нашых продкаў, народныя святы адзначаем. Дзень вёскі ладзім на Макаўе — 14 жніўня. Гулянні праходзяць на Вялікдонным каладзежы ў Новым Дзядзіне. Прыязджаюць і тыя, хто з'ехаў, і з іншых раёнаў і нават абласцей. Самы галоўны абрад, які мы адрадзілі, — зазыванне дажджу ў засушлівы перыяд. Ён занесены ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

— Веданне традыцый дапамагае мацней любіць сваю зямлю і традыцыі, — пераканана Ірына. — Калі мы не будзем гэта захоўваць, згінем як нацыя. Мы свае песні спяваем сэрцам — не кожнаму гэта дадзена. Трэба жыць на гэтай зямлі і любіць яе.

Шмат эмоцый падарыў народны ансамбль народнай песні «Вяселле» з вёскі Калгары Асіповіцкага раёна, які акапэльна прэзентаваў народную песню.

— Яе спявала яшчэ яе бабуля, — падзялілася канцэртмайстар Антаніна Сяргееўна.

— Яна наогул была добрая пявуння. Спявала і ў агародзе, і дома, калі вышывала, шмат песень ведала.

Творчая візітоўка Быхаўскага раёна — народны фальклорны ансамбль «Багатуха» і тэатральны народны гурт «Крыніца». Разам яны паказалі невялікі ўрывак з народнага свята Валачобнікі. Яно чымсьці нагадвае добра вядомую ўсім традыцыю калядаваць.

— Адрозненне толькі ў тым, што свята праводзіцца не на Раство, а на першым тыдні Вялікадня, — удакладняе **кіраўнік тэатральнага народнага гурта «Крыніца» Вольга УЛАСАВА.** — Нашы продкі хадзілі па людзях, жадалі дабра, спявалі велікодныя песні, прымалі ў падарунак фарбаваныя яйкі. Такая традыцыя была ў вёсках Холстава, Сушчова, Маліноўка. Зараз там практычна ўжо ніхто і не жыве. А калісьці вось так весела адзначалі велікоднае свята. Садзіліся на пагорку, качалі яйкі, гулялі ў біткі, узвялічвалі Вялікдзень і добрых людзей. Каб нагадаць пра тыя часы, мы зрабілі абрад і цяпер ездзім па вёсачках, збіраем, дарэчы, аншлагі ў мясцовых клубах. Моладзі цікава: яны ж такога і не ведалі.

А яшчэ Вольга Уласава стварае краналыня п'есы аб праблемах вымаючых вёсак, і гэта таксама прыцягнае народ. Вельмі шмат у гэтых пастаноўках шчырасці і цеплыні.

Не менш цікавыя традыцыі на Чэрыкаўшчыне. На фестываль прыехаў народны аматарскі калектыў «Родныя напевы», яго салісты аднавілі на сцэне ўрывак з абраду «Зялёныя Святкі».

— Нам болей чым 20 гадоў, два гады таму атрымалі званне «Народны», — удакладняе акампаніятар Сакалоўскага сельскага клуба і кіраўнік ансамбля «Родныя напевы» Алена Васільева. Яна, дарэчы, з ліку тых апантаных, дзякуючы якім жывае народная творчасць. Не атрымалася стаць спартсменкай, вярнулася ў родную вёску і пайшла працаваць у клуб. Самастойна навучылася іграць на гармоніку. Адно шкада, што аднадумцаў становіцца менш.

— На жаль, вёска памірае, — уздыхае яна. — Дваццаць гадоў таму ў вёсцы жылі яшчэ 500 чалавек, а цяпер — напалову менш. Нават школа сёлета закрываецца. А значыць, і шанцаў знайсці прадаўжалнікаў народных традыцый становіцца менш. Раней дзеці класамі выступалі. Зараз нас усяго сем чалавек, сярэдні ўзрост — 40—55 гадоў. У рэпертуары шмат аўтэнтычных песень, спяваем і пад гармонік, і пад «мінусоўкі». Стараемся часцей карыстацца беларускай мовай. Нам гэта вельмі падабаецца.

— Кожны з тых, хто адраджае народную творчасць, — унікальны, — запэўнівае **начальнік аддзела Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы Валянціна ВАЛЧКОВА.** — Гэтыя людзі не проста займаюцца любімай справай — яны ёй жывуць. Помню, на клімавіцкім мікнародным дзіцячым фестывалі «Залатая пчолка», дзе былі тэматычныя пляцоўкі, адна народніца з Хоцімска з раніцы да вечара іграла на гармоніку. Мне нават шкада яе стала — прапанавала адпачыць. Яна толькі адмахнулася, сказала, што людзі просяць. А вечарам пахвалілася, што яе два разы за дзень паспелі паклікаць замуж. Адным словам, гумар нараджаецца на хаду.

Дарэчы, 30 красавіка Магілёўскі абласны метадцэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы запросіць на другі этап фестывалю, які прысвечаны народнаму гумару. А на вялікім купальскім свяце ў Александрыі можна будзе ацаніць танцавальную творчасць нашых продкаў. Восенню, калі адбудзецца заключны этап фестывалю, мы даведаемся яшчэ і пра беларускія страны, якімі частавалі на Магілёўшчыне. Дарэчы, апошні этап — ён жа яшчэ і міжнародны. Аналагічнае мерапрыемства адбылося ў Магілёве чатыры гады таму. Сёлета робіцца своеасаблівая справаздача фальклорнага мастацтва, якое атрымалася адназіць і захаваць за апошнія чатыры гады.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.

УНП 807000255

ИНКАСС ЭКСПЕРТ

Годовая бухгалтерская (финансовая) отчетность
закрытого акционерного общества
«Небанковская кредитно-финансовая организация «ИНКАСС.ЭКСПЕРТ»,
составленная в соответствии с международными стандартами финансовой отчетности за 2020 год

Годовая бухгалтерская (финансовая) отчетность в полном объеме, а также аудиторское заключение, составленное по результатам аудита годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности, опубликована на веб-сайте www.incass-expert.by

Годовая консолидированная отчетность и консолидированная отчетность о деятельности банковского холдинга, в состав которого входит закрытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «ИНКАСС.ЭКСПЕРТ», размещается на веб-сайте www.bps-sberbank.by

Отчет о финансовом положении за 2020 год

(в тыс. бел. руб.)

	31 декабря 2020 года	31 декабря 2019 года
АКТИВЫ		
Денежные средства и их эквиваленты	159 323	135 507
Основные средства и нематериальные активы	8 244	7 801
Отложенные налоговые активы	89	115
Прочие активы	4 482	4 628
ИТОГО АКТИВЫ	**172 138**	**148 051**
ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ		
Обязательства		
Средства банков	155 496	133 312
Резервы под неоплаченные отпуска	213	213
Прочие обязательства	4 873	5 714
Итого обязательства	**160 582**	**139 239**
Капитал		
Уставный капитал	3 711	3 711
Нераспределенная прибыль	7 845	5 101
Итого капитал	**11 556**	**8 812**
ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ	**172 138**	**148 051**

Отчет о совокупном доходе за 2020 год

(в тыс. бел. руб.)

	2020 год	2019 год
Процентные доходы	508	279
Процентные расходы	(868)	(792)
Чистые процентные доходы	**(360)**	**(513)**
Комиссионные доходы	9 457	4 397
Комиссионные расходы	(2 889)	(1 846)
Чистые комиссионные доходы	**6 568**	**2 551**
Чистые доходы по операциям с иностранной валютой	(34)	(47)
Доходы по инкассации	14 812	13 571
Доходы по перевозке	12 697	11 612
Прочие доходы	6 379	9 701
Итого операционные доходы	**40 062**	**36 875**
Операционные расходы	(35 798)	(32 077)
Прибыль до налогообложения	**4 264**	**4 798**
Расходы по налогу на прибыль	(1 520)	(1 689)
Прибыль за отчетный год	**2 744**	**3 109**
Прочий совокупный доход за отчетный год	**-**	**-**
ИТОГО СОВОКУПНЫЙ ДОХОД	**2 744**	**3 109**
Базовая прибыль на простую акцию	0,2744	0,3109

Отчет об изменениях в капитале за 2020 год

(в тыс. бел. руб.)

	Уставный капитал	Нераспределенная прибыль	Итого капитал
Остаток на 31 декабря 2018 года	**3 711**	**1 992**	**5 703**
Совокупный доход			
Прибыль за отчетный год	-	3 109	3 109
Остаток на 31 декабря 2019 года	**3 711**	**5 101**	**8 812**
Совокупный доход			
Прибыль за отчетный год	-	2 744	2 744
Остаток на 31 декабря 2020 года	**3 711**	**7 845**	**11 556**

Отчет о движении денежных средств за 2020 год

(в тыс. бел. руб.)

	2020 год	2019 год
Денежные потоки от операционной деятельности		
Проценты полученные	509	279
Проценты уплаченные	(625)	(792)
Комиссии полученные	8 612	4 397
Комиссии уплаченные	(2 796)	(1 833)
Реализованный результат по операциям с иностранной валютой	4	(1)
Прочие операционные доходы	34 575	33 549
Операционные расходы	(34 316)	(31 091)
Налог на прибыль	(1 549)	(1 463)
Движение денежных средств, полученных от операционной деятельности до изменений в операционных активах и обязательствах	**4 414**	**3 045**
Чистое увеличение операционных активов/обязательств		
Прочие активы	(146)	(649)
Средства банков	22 184	80 108
Прочие обязательства	1 447	8 015
Чистые денежные потоки от операционной деятельности	**27 899**	**90 519**
Денежные потоки от инвестиционной деятельности		
Приобретение основных средств и нематериальных активов	(3 060)	(2 000)
Чистое расходование денежных средств от инвестиционной деятельности	**(3 060)**	**(2 000)**
Денежные потоки от финансовой деятельности		
Платежи в отношении основной суммы обязательства по аренде	(1 264)	(1 227)
Чистое расходование денежных средств от финансовой деятельности	**(1 264)**	**(1 227)**
Чистое увеличение денежных средств и их эквивалентов	**23 575**	**87 292**
Влияние изменений обменных курсов на денежные средства и их эквиваленты	241	(192)
Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода	**135 507**	**48 407**
Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода	**159 323**	**135 507**

Председатель Правления Э.Г. Гонтарь

Главный бухгалтер Е.М. Грибанова

Дата подписания: 01.03.2021 г.

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона)

по поручению Речицкого районного потребительского общества (продавец) извещает о проведении 30 апреля 2021 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена продажи (с НДС, бел. руб.	Задаток (10 %) с НДС, бел. руб.
1	Наименование холодильного оборудования: камера т/изоэлектр. холод. KXH-31.4	2736,00	273,60
2	Наименование холодильного оборудования: камера т/изолир. холод. KXH-11	1152,00	115,20

Дата проведения предыдущего аукциона 31.03.2021 г. Выход – 16.03.2021 г. в газете «Звязда».

Продавец: Речицкое районное потребительское общество, г. Речица, ул. Привокзальная, 2. Конт. тел. +375296900010.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.

Для участия в аукционе необходимо: 1. Оплатить задаток на расчетный счет Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»:

р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с 10.00 до 13.00 и 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения. Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 29.04.2021 г. в 17.00.

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее – ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский языки; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский языки; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность, предоставленная гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в срок, указанный в заключенному договору купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участникам аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости объекта. Проводится аукцион в соответствии с Положением ООО «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества. Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29**
Предмет аукциона – капитальное строение, расположенное по адресу: Могилевская обл., Могилевский р-н, М-4, 190-й км, 1	
Здание придорожного кафе (здание специализированное для общественного питания) общей площадью 78,7 кв. м, инв. номер 700/С-12581. Составные части и принадлежности: асфальтное покрытие, площадка	**Начальная цена с НДС 20 % – 68 514,44 бел. руб.**
Сведения о земельном участке с кадастровым номером 724484000001000033: предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания объекта придорожного сервиса общей площадью 0,1688 га	
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона	
Условия оплаты предмета аукциона: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **10 рабочих дней** с момента заключения договора купли-продажи	

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Передача имущества победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.

Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода права на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.

Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**21.05.2021 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**19.05.2021 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Открытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

(www.belincasgroup.by)

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.04.2021

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2021	01.01.2021
1	2	3	4	5
1	АКТИВЫ			
2	Денежные средства	1101	3 601	3 916
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	3 635	19 387
5	Средства в банках	1104	51 243	37 539
6	Ценные бумаги	1105	-	-
7	Кредиты клиентам	1106	-	-
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	70 650	70 643
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	606	715
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	-	-
13	Отложенные налоговые активы	1112	-	-
14	Прочие активы	1113	13 431	14 830
15	ИТОГО активы	11	143 166	147 030
16	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	-	-
19	Средства клиентов	1203	2 200	9 798
20	Ценные бумаги банка	1204	-	-
21	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	9 579	7 108
24	ВСЕГО обязательства	120	11 779	16 906
25	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
26	Уставный фонд	1211	121 002	121 002
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	7 801	243
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	-	-
30	Накопленная прибыль	1215	2 584	8 879
31	ВСЕГО собственный капитал	121	131 387	130 124
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	143 166	147 030

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 01.04.2021

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	на 01.04.2021	на 01.04.2020
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	1 190	866
2	Процентные расходы	2012	-	-
3	Чистые процентные доходы	201	1 190	866
4	Комиссионные доходы	2021	12 596	7 980
5	Комиссионные расходы	2022	10	56
6	Чистые комиссионные доходы	202	12 586	7 924
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-	-
